ПРАЛЕТАРЫЯ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 19 | НЯДЗЕЛЯ, 22 СТУДЗЕНЯ 1933 Г. | № 19

ПЛЕНУМ ГК КП(б)Б—23 СТУДЗЕНЯ.

23-ГА СТУДЗЕНЯ, А 6-Й ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ, У ВЯЛІКАЙ ЗАЛІ ГАРКОМУ КП(б)Б СКЛІКАЕЦЦА **ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ ГАРКОМУ КП(б)Б** З АБВЕСТКАЙ ДНЮ:

1. ВЫНІКІ ПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ РАШЭНЬНЯЎ ЦК І ЦКК КП(б)Б ПА ПРАВЯДЗЕНЬНЮ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ І ДАЛЕЙШЫХ ЗАДАЧАХ—ДАКЛАДЧЫК Т. МІЦЬКОЎ.

2. АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ І МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА ПАДНЯЦЬЦЮ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ—ДАКЛАДЧЫК ТАВ. КАРДАШЭНКА.

3. АБ БАРАЦЬБЕ З ЦЯКУЧАСЬЦЮ РАБОЧАЙ СІЛЫ (АРГАНІЗАВАНЫ НАБОР РАБСІЛЫ, ПРАГУЛЫ, МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ПАПЯРЭДЖВАЮЧЫЯ ЦЯКУЧАСЬЦЬ)—ДАКЛАДЫ ДЫРЭКТАРОЎ Ф-КІ «КІМ»—ФРЭЙДЗІНА, ШЧАТКОМБУ—МАЦКІНА І ФАНЭРНАГА ЗАВОДУ—МАЛЬЧЫКА З САДАКЛАДАМ РСІ.

4. ІНФАРМАЦЫЯ АБ ПЕРАБУДОВЕ РАБОТЫ ЗРК І ХОДЗЕ САМАЗАГАТОВАК—ДАКЛАДЧЫК Т. РАЗУМАЎ.

НА ПЛЕНУМ ЗАПРАШАЮЦЦА: ТРОХКУТНІКІ ЎСІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ЎСТАНОЎ, ДЫРЭКТАРЫ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ, СЭКРАТАРЫ ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК НАВУЧ УСТАНОЎ, КІРАЎНІКІ КАЛГАСНА-ЗЯМЕЛЬНЫХ ВОРГАНАЎ, СТАРШЫНІ ЗРК І ЗАГАТОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, РАБОТНІКІ ІНСПЭЦЫІ ЦРАЦЫ (КАМУНІСТЫ), ЧЛЕНЫ ЦК І ЦКК КП(б)Б, ЧЛЕНЫ ГАРКК, ЧЛЕНЫ ГАРКОМУ КСМ (КАМУНІСТЫ).

СЭКРАТАР ГАРКОМУ КП(б)Б МІЦЬКОЎ.

ДАРАГІ тав. СТАЛІН!

Табе, лепшаму ленінцу, любімаму правадыру вялікай, загартаванай у баёх ленінскай партыі і мільённых мас сусьветнага пралетарыяту, горачае бальшавіцкае прывітаньне шле віцебская партыйная арганізацыя!

Гістарычныя перамогі ў выкананьні першай пяцігодкі за чатыры гады, атрыманыя партыяй і пралетарыятам, зьяўляюцца вынікам твайго непасрэднага кіраўніцтва, тваёй няўстаннай бальшавіцкай пільнасьці і бязьлітаснай барацьбы супроць трацкістаў, правых і „левых" апартуністаў і прымірэнцаў да іх. Гэтыя перамогі яскрава пацьвярджаюць правільнасьць і ленінскую сутнасьць тэарытычнай і практычнай барацьбы, праводзімай табой у барацьбе за пабудову сацыялізму ў нашай краіне. Ты заклікаў і павёў партыю на пераможны разгром кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, вызначыў нашы далейшыя задачы ў другой пяцігодцы і выкаваў адзінства і жалезную дысцыпліну партыйных радоў.

З надзвычайнай глыбінёй табой па-бальшавіцку ўскрыты недахопы нашай работы на вёсцы і вызначаны далейшыя шляхі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Твае дырэктывы аб аўладаньні тэхнікай і шэсьць гістарычных указаньняў забясьпечылі партыі і пралетарыяту перамогі сусьветна-гістарычнага значэньня. Твая выключнай важнасьці праца па тэарытычнай распрацоўцы і практычным правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі ператварыла былыя царскія калёніі і ў тым ліку БССР, у сацыялістычную цытадэль на рубяжы двух сьветаў, двух сыстэм.

Няхай жыве ленінская сталёвая партыя на чале з тав. Сталіным!

Няхай жыве правадыр і настаўнік сусьветнага пралетарыяту т. Сталін!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

АКТЫЎ ВІЦЕБСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б.

ДА ПЛЕНУМУ ГАРКОМА КП(б)Б.

Заўтра пачынаецца чарговы пленум гаркому партыі. Адбываючыся сьледам за гістарычным для партыі і краіны аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б), які падвёў вынікі першай пяцігодкі і вызначыў праграму барацьбы партыі на ўсіх участках будаўніцтва бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва і на вучастку работы ў вёсцы ў прыватнасьці, пленум гаркому маё сваёй непасрэднай задачай выпрацоўку мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі чоткае бальшавіцкае ажыцьцяўленьне гэтай сусьветна-гістарычнага значэньня праграмы.

„У рэзультаце няўхільнага правядзеньня палітыкі індустрыялізацыі і разгорнутага сацыялістычнага наступу па ўсім фронце, рабочая кляса СССР пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі пасьпяхова выканала асноўную задачу пяцігодкі—стварэньне ўласнай перадавой тэхнічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі" (пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б). Выкананьне гэтай асноўнай задачы патрабавала ад партыі і рабочае клясы напружаньня ўсіх сіл, разьвіцьця нябачных у гісторыі тэмпаў, падхлёстваньня ўсёй краіны. Выкананьне гэтай асноўнай задачы патрабавала асабліва хуткіх тэмпаў, асаблівай напружанасьці і асаблівай дапамогі ўсяго Савецкага саюзу былым калёніяльным украінам царскай Расіі, якія нават у параўнаньні з такой адсталай краінай, як сама Расія, знаходзіліся на яшчэ больш нізкай ступені эканамічнага і культурнага разьвіцьця.

Некалькі лічбаў з вынікаў першай пяцігодкі па Віцебшчыне—часьцы Савецкай Беларусі—з усёй навочнасьцю сьведчаць аб індустрыяльным і культурным узросьце нацыянальных рэспублік, як прамы вынік ленінскай нацпалітыкі, няўхільна ажыцьцяўляемай нашым бальшавіцкім ЦК УсеКП(б) пад кіраўніцтвам т. Сталіна. Вось яны, гэтыя лічбы: асноўны капітал рэспубліканскай прамысловасьці Віцебску ў 1928 годзе—11.834.000 руб., на 1 студзеня 1932 г.—28.151.000 руб.—рост 238 проц., рабочых па гэтых прадпрыемствах: 1 кастрычніка 1928 г.—7294, 1 кастрычніка 1932 г.—17.632, рост—241,7 проц., рост рабочай сілы па мясцовай прамысловасьці—297 проц., ахоп дзяцей школамі ў 1913 г. складаў 33 проц. у горадзе і 25 проц. у вёсцы, а ў 1932 г. адпаведна—99,9 проц. і 98,5 проц.

Гэта гаворыць аб вельмі і вельмі многім. Гэта сьведчыць аб вялікай перамозе ленінскай палітыкі. І ў сьвятле гэтай перамогі ясна выдзяляецца разрыў паміж эканамічнасай і культурнай базай уздыму нашага гораду і раёну і нашай партыйна-масавай і масавай работы ізогул у галіне ажыцьцяўленьня ленінскай нацпалітыкі. „Самы глыбокі прарыў" у рабоце віцебскай партарганізацыі, адзначаны ЦК і ЦКК КП(б)Б яшчэ ў 1931 годзе, намі не ліквідаваны. Вось чаму вялізарнейшае палітычнае значэньне павінна адыграць абгаварэньне пленумам гаркому дакладу т. Міцькова аб выніках праверкі выкананьня рашэньняў ЦК і ЦКК КП(б)Б па правядзеньні нацпалітыкі і далейшых задачах у гэтай галіне. Рашэньні пленуму павінны вызначыць палітычныя і практычныя шляхі далейшай барацьбы партарганізацыі за ленінскую нацпалітыку, павінны ўзброіць кожнага камуніста праграмай бальшавіцкай работы на гэтым важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва і загартаваць яго на жорсткую барацьбу з клясавым ворагам і яго агэнтурай, пралезшай у рады партыі, якія сваю контррэвалюцыйную дзейнасьць прыкрываюць фальшыва-нацыянальным сьцягам.

„Пераход да калектыўнай гаспадаркі, як пераважаючай форме гаспадаркі, не паляпшае, а павялічвае нашы клопаты аб сельскай гаспадарцы, не памяншае, а павялічвае кіруючую ролю камуністаў у справе ўздыму сельскай гаспадаркі". Практычнаму праламленьню гэтага праграмнага паказаньня нашага правадыра павінны быць прысьвечаны абгаварэньне дакладу т. Кардашэнкі аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і мерапрыемствы па падняцьці ўраджайнасьці і рашэньні па гэтых пытаньнях.

Перад пленумам гаркому стаіць адказнейшая і складанейшая задача: улічыўшы памылкі і недахопы пры правядзеньні загатовак, з усёй бальшавіцкай праматой ускрытыя т. СТАЛІНЫМ на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б), узброіць партарганізацыю і кожнага камуніста чоткімі паказаньнямі на тое, ЯК трэба кіраваць калгасамі, каб зрабіць іх сапраўды бальшавіцкімі, ЯК трэба ўмацоўваць калгасы арганізацыйна, ЯК трэба вышыбаць адтуль шкодніцкія элемэнты, ЯК трэба змагацца з ворагамі народу, расхішчаючымі калгасную маёмасьць, ЯК трэба падбіраць сапраўдныя праверэныя бальшавіцкія кадры для калгасаў, ЯК трэба асвоіць нашы калгасы, узьняць у іх прадукцыйнасьць працы і ўраджайнасьць, ЯК ператварыць наш прыгарадны раён у раён узорнага земляробства.

Падвышэньне ўраджайнасьці—цэнтральная задача. Яе вырашэньне адбываецца ва ўмовах самай жорсткай клясавай барацьбы. Кулаччо, былыя дваранчыкі, афіцэры і бандыты, пралязаючы ў калгасы, прабіраючыся там на пасады брыгадзіраў, рахункаводаў, кладаўшчыкоў і, нават, членаў праўленьняў і рэвкамісій, імкнуцца арганізаваць сабатаж сяўбы, арганізаваць недасеў, ворыва з агрэхамі, сяўбу папсаваным насеньнем, псаваньне і дрэннае скарыстаньне інвэнтару, пагоршаньне цяглавай сілы і г. д. Мабілізаваць партарганізацыю і ўвесь сумленны калгасны актыў на выкрыцьцё клясавага ворага і яго махінацый, на выгнаньне яго з калгасаў, на ўпартае авалодваньне тэхнікай сельскай гаспадаркі, на ўпартую барацьбу за павялічэньне ўраджайнасьці і прадукцыйнасьці, арганізаваную бальшавіцкую падгатоўку да веснавой сяўбы, памятаючы, што «самацёк цяпер можа пагубіць усю справу» (Сталін)—задача пленуму.

Нарэшце, абгаварэньне пленумам дакладаў дырэктароў трох прадпрыемстваў аб барацьбе з цякучасьцю рабочай сілы і даклада т. Разумава аб перабудове работы ЗРК і самазагатоўках павінна ўзмацніць нашы пазыцыі ў барацьбе за прамфінплян. Асваеньне новых і рэканструяваных прадпрыемстваў (а гэта—амаль уся наша віцебская прамысловасьць), павышэньне прадукцыйнасьці працы і сацыялістычнай дысцыпліны працы, поўнае і безагаворачнае выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну, палепшаньне рабочага снабжэньня і ачыстка прадпрыемстваў ад клясавага ворага—вара, прагульшчыка і лодыра—вось задачы, якімі будзе кіравацца пленум, абгаварваючы гэтыя даклады і прымаючы па іх свае рашэньні.

Работа пленуму гаркома павінна будзе яшчэ раз даказаць, што «партыя непераможна, калі яна ведае, куды весьці справу і не палохаецца труднасьцяй» (Сталін).

АСВАЕНЬНЕ НОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ—ТАКАВА ЗАДАЧА.

26 СТУДЗЕНЯ, А 7 ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ, РЭДАКЦЫЯ „ВІЦЕБСКАГА ПРАЛЕТАРА" сумесна з гарМБІТ'ам склікае нараду інжынэраў, тэхнікаў, плянавікоў, загадчыкаў цэхаў, рэдактароў шматтыражак і насьценных газэт з наступных прадпрыемстваў: панчошнай фабрыкі імя КІМ, шчаціна-шчотачнага камбінату, маслазаводу, швэйнай „Сьцяг індустрыялізацыі", прадпрыемстваў, што вырабляюць будматэрыялы, панчошнай імя Клары Цэткін і лесазавод імя „Правды".

На абвестцы дню: задачы 1933 году ў галіне асваеньня новых прадпрыемстваў.

Яўка прадстаўнікоў усіх пералічаных прадпрыемстваў абавязкова.

Запрашаюцца ІТР астатніх прадпрыемстваў, а таксама брыгадзіры гаспразрахунковых брыгад і ўдарнікі.

Нарада адбудзецца ў габінэце рэдактара „Віцебскага пралетара" (Палац працы, пакой № 42).

Рэдакцыя «Віцебскага пралетара».
ГарМБІТ.

Аб выніках аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

РЭЗАЛЮЦЫЯ АКТЫВУ ВІЦЕБСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПА ДАКЛАДУ Т. УБАРЭВІЧА.

1. Заслухаўшы і абгаварыўшы даклад тав. Убарэвіча аб рашэньнях аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), схоп актыву віцебскай партыйнай арганізацыі ЦАЛКАМ І ПОЎНАСЬЦЮ ДАЛУЧАЕЦЦА І АДАБРАЕ РАШЭНЬНІ ПЛЕНУМУ, якія адыгрываюць вялікае гістарычнае значэньне ў жыцьці партыі і ўсёй краіны, пераможна завяршыўшай першую бальшавіцкую пяцігодку і ўступіўшы ў палёту новых вялікіх работ, забясьпечваючых пабудову ў СССР бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Віцебскі партактыў салкам далучаецца да рэвалюцыйнага пленуму і актыву Масквы па дакладу тав. Кагановіча і ленінградзкага партактыву па дакладу тав. Кірава аб выніках студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б). Рашэньні маскоўскіх і ленінградзкіх бальшавікоў—маналітнай апоры партыі — зьяўляецца люстрам АДНАДУШНАГА ПАДТРЫМАНЬНЯ рашэньняў гістарычнага пленуму ўсёй партыяй, пралетарыятам і калгасным сялянствам СССР. Рашэньні пленуму і бальшавікоў Масквы і Ленінграду—паказчык адзінства, маналітнасьці, цьвёрдай ленінскай палітыкі партыі і яе ЦК, які узначальваецца тав. Сталіным, паказчык непрымірымасьці ўсёй партыі і яе ленінскага кіраўніцтва з малейшымі спробамі сказіць і рэвізаваць яе генэральную лінію.

2. «У рэзультаце няўхільнага правядзеньня палітыкі індустрыялізацыі і разгорнутага сацыялістычнага наступу па ўсім фронце, рабочая кляса СССР пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі пасьпяхова выканала асноўную задачу пяцігодкі—стварэньне ўласнай перадавой тэхнічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

У абстаноўцы развалу эканомікі капіталістычных краін пры нябывалым росьце ў гэтых краінах беспрацоўя, жабрацтва, галечы—выкананьне пяцігодкі ў СССР ня ў пяць, а ў чатыры гады (дакладней у чатыры гады і тры месяцы) ёсьць факт найбольш выдатны ў сучаснай гісторыі» (з рэзалюцыі пленуму).

Такім чынам, як ніколі на працягу ўсяго часу існаваньня саюзу рэспублік „зараз свае галоўнае ўзьдзейнічаньне на міжнародную рэвалюцыю мы аказваем сваёй гаспадарчай палітыкай» (Ленін).

У рэзультаце ажыцьцяўленьня прынятай партыяй лініі паскораных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР разьвязаны пэсьць асноўных задач першай пяцігодкі: мы перайшлі на рэйкі новай тэхнікі; СССР ператварыўся з краіны дробна-сялянскай у краіну індустрыяльную, незалежачую ад капрызаў капіталістычных краін; рост элемэнтаў сацыялізму стварыў эканамічную базу для зьнішчэньня клясаў; рашаючыя посьпехі дасягнуты ня толькі ў пераўзбраеньні прамысловасьці, але-ж і транспарту і сельскай гаспадаркі; мы перайшлі на буйную калектыўную сельскую гаспадарку.

Пасьпяхова праводзіцца палітыка ліквідацыі кулацтва, канчаткова падарваны карэньні капіталізму ў вёсцы, зьнішчана магчымасьць расслаеньня сялянства. Мільённыя масы беднякоў і сераднякоў упяршыню ў гісторыі вызвалены ад кулацкай кабалы, жабрацтва і нявуцтва і ў СССР створаны эканамічныя і тэхнічныя ўмовы сваёй абароназдольнасьці. СССР ператварыўся „у краіну, здольную вытвараць у масавым маштабе ўсе сучасныя прылады абароны і снабжаць імі сваю армію ў выпадку нападу звонку".

3. «Асновай сусьветна-гістарычных перамог партыі і рабочай клясы ў першай пяцігодцы, новых перамог у пабудове сацыялізму была і застаецца генэральная лінія, выкаваная і праводзімая ў бязьлітаснай барацьбе супроць контр-рэвалюцыйнага трацкізму, супроць апартуністаў і перш за ўсё супроць галоўнай—праваапартуністычнай кулацкай небясьпекі.

Кіруемая т. Сталіным партыя разграміла контррэвалюцыйных трацкістаў і правых апартуністаў (Бухарын, Рыкаў, Томскі).

У вялікай гістарычнай барацьбе за пяцігодку т СТАЛІН—натхніцель вялікага пляну сацыялістычных работ, узброіў партыю ленінскім разуменьнем задач сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, даў партыі і рабочай клясе разгорнутую праграму сацыялістычнай індустрыялізацыі, мабілізаваў партыю на ажыцьцяўленьне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыю кулацтва як клясы» (з рэзалюцыі МК).

4. Цалкам адабраючы намечаны пленумам ЦК і ЦКК сярэдня-гадавы прырост прамысловай прадукцыі ў другой пяцігодцы на 13—14 процантаў і прыняты на 1933 год народнагаспадарчы плян, пры сярэднім прыросьце прадукцыі на 16,5 проц., ПАРТАКТЫЎ СТАВІЦЬ ПЕРАД ВІЦЕБСКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ, перад усімі пралетарамі галоўнейшую задачу—упартая барацьба з прагуламі і разьгільдяйствам на вытворчасьці, удым прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту, палепшэньне якасьці прадукцыі пры неабходнасьці ПОЎНАГА І БЕЗАГАВОРАЧНАГА ВЫКАНАНЬНЯ КОЛЬКАСНЫХ ПАКАЗЧЫКАЎ ПРАМФІНПЛЯНУ. Актыў падкрэсьлівае, што ва ўмовах віцебскай прамысловасьці ў большасьці пабудаванай і рэканструяванай у першай пяцігодцы, рашаючае значэньне набывае рашэньне пленуму ЦК і ЦКК—«што другая пяцігодка, калі яна хоча разьлічваць на сур'ёзны посьпех, павінна даповніць цяперашні лёзунг НОВАГА БУДАЎНІЦТВА новым лёзунгам АСВАЕНЬНЯ новых прадпрыемстваў і новай тэхнікі».

5. Прамова тав. Сталіна аб рабоце на вёсцы—праграмны дакумант для ўсёй партыі ў яе рабоце ў галіне сельскай гаспадаркі, у яе барацьбе за сацыялістычнае перавыхаваньне калгасьніка—учорашняга аднаасобніка, у яе барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, у яе барацьбе за ўмацаваньне атрыманай сусьветна-гістарычнай перамогі ў сельскай гаспадарцы БАЛЬШАВІЗАЦЫЯЙ калгасаў.

Партактыў заклікае „усю партыйную арганізацыю даць самы рашучы адпор усялякай спробе падмяніць сапраўднае бальшавіцкае кіраўніцтва калгасным рухам дробна-буржуазнай ідэалізацыяй калгасаў. Кожная партыйная арганізацыя і кожны камуніст павінны павесьці самую ўпартую барацьбу з новымі манэўрамі клясавага ворага, спрабуючага разлажыць калгасы знутры. Вышэй клясавую пільнасьць! Бязьлітасна расправімся з шкоднікамі, якія прабраліся ў рад калгасаў, савгасаў і зямельных органаў" (з рэзалюцыі пленуму МК).

На сучасным этапе, як ніколі, кожны камуніст абавязан памятаць паказаньне тав. Сталіна аб тым, што „МЫ стаім ва ўладзе, МЫ распалагаем сродкамі дзяржавы, МЫ закліканы кіраваць калгасамі і МЫ павінны несьці ўсю паўнату адказнасьці за работу ў вёсцы".

Партактыў яшчэ раз падкрэсьлівае ўсю адказнасьць усёй партарганізацыі за рэалізацыю абавязацельства, узятага сходам актыву пасьля сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб ператварэньні Віцебскага раёну У РАЁН УЗОРНАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА. Гэта абавязвае значна ўзмацніць аб'ём і якасьць падрыхтоўкі да веснавога севу, узьняць адказнасьць і практычную работу шэфствуючых прадпрыемстваў, робячаеся яшчэ больш адказным у сувязі з разгортваньнем вытворчага шэфства над МТС і МТМ, якія пры дапамозе і арганізуючым удзеле пралетарскіх гарадоў павінны ўзмацніць свой палітычны ўплыў у вёсцы.

6. Партактыў падкрэсьлівае неабходнасьць вядзеньня больш рашучай і непрымірымай барацьбы з пранікненьнем на прадпрыемствы і шкодніцтвам пранікаючых клясава-варожых элемэнтаў у асяродзьдзе рабочае клясы і нават партыі. Партактыў з усёй рэзкасьцю падкрэсьлівае, што рашэньне ГК і ГКК і актыву ад 11 студзеня дагэтуль яшчэ не знайшло поўнага і патрэбнага праламленьня ў радзе зьвеньняў арганізацыі і асабліва па частцы непрымірымасьці да гніла-лібэральных і перараджэнцкіх элемэнтаў, прыкрываючых і дапамагаючых пакасьніцтву клясавага ворага.

Галоўнейшай задачай партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый, кожнага камуніста, рабочага і калгасьніка зьяўляецца рашучая барацьба з раскрадальнікамі грамадзкай уласнасьці, далейшае ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры, падвышэньне рэвалюцыйнай клясавай пільнасьці. „Рэвалюцыйная пільнасьць зьяўляецца той самай якасьцю, якая асабліва неабходна зараз бальшавікам". Сільная і моцная дыктатура пралетарыяту—вось што нам патрэбна зараз для таго, каб разьвеяць упрах апошнія рэшткі ўміраючых клясаў і разьбіць іх варэўскія махінацыі". (Сталін).

7. Партактыў салкам адабрае рашэньне пленуму ЦК і ЦКК аб антыпартыйнай групоўцы Эйсманта, Талмачова, Сьмірнова А. П. аб выключэньні з радоў партыі буржуазных перараджэнцаў Эйсманта і Талмачова і з складу ЦК А. П. Сьмірнова. Лічачы зусім правільным рашэньне пленуму аб т.т. Томскім, Рыкаве і Шмідце, якія замест актыўнай барацьбы за лінію партыі падтрымлівалі сувязь са Сьмірновым і Эйсмантам—актыў патрабуе ад іх сапраўды бальшавіцкай актыўнай барацьбы за генэральную лінію партыі і практычную палітыку ЦК, супроць усіх контррэвалюцыйных груповак і ўсялякіх ухілаў, супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, супроць двурушнікаў і прымірэнцаў.

Набліжаючаяся чыстка радоў партыі павінна прайсьці пад знакам ачысткі яе «ад прымазаўшыхся, чужых і няўстойлівых элемэнтаў, ад жулікаў з партбілетам у кішэні», ад усіх тых, хто на словах за генэральную лінію партыі, а на справе яе сабатуе. Актыў падкрэсьлівае выключнае значэньне, якое набывае чыстка партыі ва ўмовах БССР, як прымежнай частцы саюзу, дзе ў час чысткі побач з яе агульнымі задачамі павінна быць з усёй поўнатой разьвязана задача ачысткі партыі ад буржуазна-нацыяналістычных элемэнтаў, ад тых, хто сваю контррэвалюцыйную дзейнасьць прыкрывае фальшывым нацыянальным сьцягам.

8. Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і тав. Сталіна КП(б)Б і ў ў яе перших радох віцебская арганізацыя, цьвёрдай рукой раздаўляючы асколкі трацкістаў і правых апартуністаў—галоўнай небясьпекі на сучасным этапе, ідуць да новых гістарычных перамог, яшчэ больш згуртоўваючи і загортваючы свае рады ў баёх за канчатковую перамогу сацыялізму, за пашырэньне з кожным днём і месяцам базы сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Мы ўпэўнены ў нашай канчатковай перамозе. НАША ПЕРАМОГА ЗАБЯСЬПЕЧАНА ПОЎНАСЬЦЮ, БО КРАІНУ САВЕТАЎ ВЯДЗЕ НАШЕРАД ЛЕНІНСКАЯ ПАРТЫЯ І ЯЕ ПРАВАДЫР ТАВ. СТАЛІН.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ ЦК УсеКП(б)!

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАШ НАСТАЎНІК І КІРАЎНІК, НАШ ПРАВАДЫР Т. СТАЛІН!

КАТЭДРА ПРАДАСТАЎЛЕНА КОНТР-РЭВАЛЮЦЫІ.

ПРЫТУПЛЕНЬНЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ПІЛЬНАСЬЦІ—ГЛЕБА ШКОДНІЦКАЙ РАБОТЫ ПРАФЭСАРА ПЭЛІХАВА.

Тав. Сталін у сваім дакладзе на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) указаў, што „у выніку ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў галіне прамысловасьці сельскай гаспадаркі і гандлю, мы зацьвердзілі ва ўсіх сфэрах гаспадаркі прынцып сацыялізму, выгнаўшы адтуль капіталістычныя элемэнты"... Ладзі—прадстаўнікі выгнаных капіталістычных элемэнтаў, засеўшыя ў розныя вашы ўстановы, знаходзячы слабыя месцы, шкодзяць савецкай уладзе, шкодзяць рабочым і сялянам.

„Пайсьці ў прамую атаку супроць савецкай улады гэтыя паны ўжо ня ў сілах. Яны і іх клясы вялі ўжо некалькі раз такія атакі, але былі разьбіты і расьсеяны... І яны пакасьцяць як толькі могуць, дзеючы ціхай сапай"... (Сталін).

Так, пад крылышкам гніла лібэралізму з боку дырэкцыі вэткамбінату, праводзіць сваю работу нядаўна прыехаўшы прафэсар катэдры зоотэхнікі Пэліхаў.

Дамо некалькі фактаў работы Пэліхава.

Пачалася ўводная лекцыя. Для тлумачэньня прадукцыйнасьці жывёлагодоўлі усе лічбы прыводзацца 1913 году.

— Чаму не бярэце сучасныя лічбы?—запытваў студэнт.

— Бачыце, зараз лічбы няўстойлівыя для росту прадукцыйнасьці (?!), таму я гавару аб тым, што мы мелі раней, а мы ўсё роўна рускі народ (!!).

Прафэсар працягвае далей:

— Былі памешчыкі, вось яны і выводзілі культурных жывёл, маючых асаблівасьці, рысакі ў графа Арлова, а зараз іх у нас, як быццам (?) ёсьць прадпасылкі для жывёлагадоўлі.

І далей..

„Адкуль мы бярэм матар'ял для характарыстыкі пастушшага пэрыяду?

„Аб гэтым пэрыядзе вы зможаце знайсьці матар'ял, запісаны ў бібліі".

А лекцыя працягваецца..

„Зараз ужо прыручана чалавекам каля 50-ці відаў жывёлы. Многія віды знаходзяцца ў стадыі прыручэньня, у Амэрыцы прыручаюць востра-бурую лісіцу і ў нас прыручаюць, але у Амэрыцы дасягнулі ўжо вялізарных у гэтым напрамку рэзультатаў, а ў нас—я ня ведаю (?!) і бяда ў тым, што ў апошні час вельмі цяжка дастаць з Амэрыкі літаратуру"—выказаў з болем прафэсар шкоднік.

Лічым, што камэнтарыяў не патрэбна. Патрэбна толькі сказаць, чаму данны прафэсар дагэтуль яшчэ выкладае? Аб ім гавораць толькі па інтэрнатах, калідорах і г. д., а ён-жа ўжо 2—3 месяцы вядзе курс „Б". Гэта зьяўляецца рэзультатам прымірэнцкіх, гніла-лібэральных адносін з боку дырэкцыі і кіраўніцтва партыйнай арганізацыі і асобных членаў партыі (асабліва курсу „Б") да падобных праяў контр-рэвалюцыі. Гэта аказалася магчымым у камбінаце ў рэзультаце і прамога і заахвачвання заціску крытыкі і самакрытыкі, што мае месца ў сьценах інстытуту, у рэзультаце прытупленьня рэвалюцыйнай пільнасьці.

Нам. дырэктара камбінату—загадчык навукова-дасьледчага сэктару—камуніст Старынскі зьяўляецца працаўніком данная катэдры, амаль ўсе члены бюро парткалектыву разам з яго сэкратаром т Жалязьняком, зьяўляюцца слухачамі прафэсара шкодніка. Камуністы камбінату забылі словы Леніна, які казаў, што: „Камуністы, не даказаўшыя свайго уменьня аб'яднаць і накіраваць работу спэцыялістаў, уваходзячы ў сутнасьць справы, вывучаючы яго дэталёва, такія камуністы часта шкодны".

Справа Пэліхава—дадаткова сур'ёзнейшы сыгнал сур'ёзнейшых спраў у вэткамбінаце.

Справамі камбінату КК-РСІ павінна заняцца ўсур'ёз.

К. Загар.

„ВЯЛІКІ ВУРОК“.

(22 (9) СТУДЗЕНЯ 1905 ГОДУ).

«Пачатак рэвалюцыі ў Расіі»—так азначыў Ул. І. Ленін пецярбургскія падзеі 22 (9) студзеня 1905 г. «Рабочая кляса,—пісаў ён,—атрымала вялікі вурок грамадзянскай вайны; рэвалюцыйнае выхаваньне пралетарыяту за адзін дзень шагнула ўперад так, як яно не магло-б шагнуць у месяцы і гады шэрага, буднічнага, забітага жыцьця».

Ленінская ацэнка расстрэлу піцерскіх рабочых, ленінскі прагноз далейшага разьвіцьця пецярбургскіх падзей аказаліся зусім правільнымі. Залпы «самага подлага, хладнакроўнага забойства беззабаронных і мірных народных мас» (Ленін) тысячагалосным водгульлем пранясьліся па ўсей Расіі, адтачылі клясавую палітычную сьвядомасьць рабочых мас, актывізавалі іх рэвалюцыйную волю, узмацнілі іх клясавую згуртаванасьць і прывялі да першай у гісторыі ўсеагульнай стачцы, паказаўшай вялікую магутнасьць пралетарскай баявой салідарнасьці.

У падзеях 22 (9) студзеня адбілася свае асаблівае спалучэньне супроцьлеглых сацыяльных зьявішч: стачка, пачатая рабочымі-пуцілаўцамі і хутка ахапіўшая ўсе буйныя заводы Пецярбургу з колькасьцю рабочых да 96 тысяч, стачка, прыняўшая яўна палітычны характар—з аднаго боку, і з другога—масавы паход да Зімовага палацу з глыбокай верай у «государя», царствуючага «милосьцю божескіх законаў» (з пэтыцыі рабочых цару).

Гэта своеасаблівае спалучэньне адбілася і ў пэтыцыі цару: «Всеподданнейшы адрес рабочих Петербурга его величеству» поўны скаргаў і просьб да цара, які «пастаўлен на счасьце народу» і разам з тым гэты „адрас“ уключае ў сябе палітычныя трэбаваньні аж да скліканьня ўстаноўчага збору, узятыя з праграмы—мінімум расійскай сацыял-дэмакратыі.

Тлумачэньне такому своеасаблівому спалучэньню ляжыць у гісторыі папярэдняй барацьбы рабочае клясы. Ужо ў 70-х гадох, на зары пралетарскага руху, рабочыя стачкі ня былі рэдкасьцю. Яны ўзгараліся ў розных канцох Расіі, як пратэст супроць нясьцерпнага ўціску капіталістаў і абшарнікаў.

80-е гады—гады крызісу (1881—86 г. г.) прыносяць далейшы рост стачачнага руху і славутую «марозаўскую стачку» у Арэхова-Зуеве, якая ахапіла 8 тысяч рабочых тэкстыльшчыкаў і была праведзена з вялізарнай вытрыманасьцю і настойлівасьцю. Стачка працягвалася восем дзён і была разгромлена толькі пры дапамозе ўзброенай сілы. Ня глядзячы на разгром, ня гледзячы на тое, што рабочыя вымушаны былі стаць на работу, не дабіўшыся задавальненьня сваіх трэбаваньняў, марозаўская стачка мела вялікае значэньне для разьвіцьця рэвалюцыйнага рабочага руху.

90-е гады далі новы ўздым стачачнай хвалі За 5 год (1895—1899) лік стачачнікаў дасягнуў поўмільёна чалавек. Стачкі становяцца ўсё упарцей, аб'ём эканамічных трэбаваньняў рабочых нашыраецца (апрача павышэньня заработаты выступае трэбаваньне скарачэньня рабочага дня да 10 гадзін), рабочыя ўсё часьцей аказваюць супраціўленьне паліцыі (фабрыка Поля ў Пецярбурзе—у 1898 г., майскія баі на вуліцах Рыгі—у 1899 г. і г. д). Стачачная барацьба, гвалт і бязьлітасныя расправы паліцыі абуджаюць у рабочых масах сьвядомасьць клясавага адзінства, агульнасьці інтарэсаў, клясавай салідарнасьці. Вяршынай гэтага росту клясавай сьвядомасьці зьяўляецца пераход рабочых да мэтадаў палітычнай барацьбы. Уся абстаноўка перыяду, яго нічым непрыкрытая палітыка абароны паліцэйскай зброяй, казачымі атакамі, залпамі салдацкіх рот, турмамі і сасланьнямі сыстэмы капіталістычнага рабунку рабочых мас, наўхільна вялі рабочых да сьвядомасьці, што эканамічная барацьба недастатковa, што ёю можна дасягнуць толькі вельмі абмежаваных мэтаў Але адна справа бачыць у паліцэйскім і губэрнатары ворага, які заўсёды становіцца на бок уціскачоў-капіталістаў, другая справа ўцяміць неабходнасьць сламіць усю палітычную сыстэму царызму, узглаўляемую «божьим помазанником»—царом. Вопыт барацьбы ўсё бліжэй падводзіў масы да асазнаньня гэтага.

Такія факты, як славутая „Абухоўская абарона“ (май 1901 г.), калі рабочыя Неўскай заставы (Пецярбург) ужо прыбеглі да барыкаднай барацьбы супроць паліцыі і войск, калі кліч „далоў самаўладзтва“ і чырвоныя сьцягі рэялі на вуліцах рабочага прадмесьця,—такія факты не праходзілі бясьсьледна.

Усё большае рэвалюцыянізуючае і арганізуючае значэньне набывала і работа сацыялдэмакратыі, перашоўшая ад гуртковай замкнутасьці да работы ў масах, да шырокай агітацыі. На выключную неабходнасьць і надзвычайную важнасьць гэтай работы маладых сацыял-дэмакратычных арганізацый паказваў Ленін. „Стачкі 90-х гадоў—пісаў ён—паказваюць нам куды больш пробліскаў сьвядомасьці. Узятыя самі па сабе гэтыя стачкі былі барацьбой трэдюніапісцкай, але яшчэ не сацыял-дэмакратычнай, яны знаменавалі сабою абуджэньне антаганізму рабочых і гаспадароў“... Сацыял-дэмакратычная сьвядомасьць „магла быць прынесена толькі знадворку“ („што рабіць“). І далей „Стыхійны ўздым мас у Расіі адбыўся в такой шпаркасьцю, што сацыял-дэмакратычная моладзь аказалася непадрыхтаванай да выкананьня гэтых задач“. Ленін не абмяжоўваецца толькі прапановай „ісьці да рабочых“. Ён намячае чоткі бальшавіцкі плян арганізацыі прафэсыянальных рэвалюцыянэраў, плян масавай газэты, якая б „стала часткай вялізарнага кавальнага меха“, раздмухваючага кожную іскру клясавай барацьбы і народнага абурэньня ў агульны пажар“ (Ленін).

Царскі ўрад спрабаваў супроцьпаставіць рэвалюцыйнай рабоце сацыял-дэмакратыі апрача карнага апарату, свой паліцэйскі «сацыялізм», вядомы па яго натхніцелю—ахраньніку Зубатаву, пад клічкай «зубатаўшчыны». Гапонаўшчына, якая адыграла ў падзеях 22 (9) студзеня выключную ролю, зьяўлялася прамым працягам зубатаўшчыны. Дапускаючы арганізаваны Гапонам «Сход рускіх фабрычна-заводзкіх рабочых гораду Санкт-Пецярбургу», урад разьлічваў накіраваць гэты рух у рэчышча сваёй чорна-соценнай палітыкі, супроцьпаставіць яго росту ўплыву сацыял дэмакратыі. Лёгіка клясавай барацьбы разьбіла ўшчэнт гэты плян. «Гапонаўскае таварыства» ня ў сілах было ні папярэдзіць стачку пуцілаўцаў, распачатую 3 (16) студзеня 1905 г., ні прымушаць яе пашырэньне. Наадварот яно прымушана было ўмяшацца ў гэту стачку, адстайваючы перад заводчыкамі трэбаваньне пуцілаўцаў. Гапон вымушан быў, каб ня страціць свайго ўплыву на масы, узглавіць з правакацыйнай мэтай магутны выбух абурэньня піцерскіх рабочых, каб накіраваць яго ў рэчышча «всеподданнейшего адреса» цару. На факце барацьбы сацыял-дэмакратыі з Гапонам да падзей 22 (9) студзеня можна бачыць, як праў быў Ленін, калі пісаў, што сацыял дэмакратыя не падрыхтавана да зўладаньня стыхійным уздымам мас Масы пайшлі за Гапонам. Але з другога боку, Гапон ня мог абысьці ў пэтыцыі тых трэбаваньняў, якія ўжо ўклініліся ў сьвядомасьць мас, і якія зьявіліся рэзультатам папярэдняй клясавай барацьбы і ўплыву на масы сацыял-дэмакратыі. Заставалася вера ў цара, яшчэ не зруй аваная рэвалюцыйнай работай. Яе зруйнаваў цар расстрэлам бязбройнай рабочай масы. У рэзультаце гэтага «рускі рабочы рух за некалькі дзён узьняўся на вышэйшую ступень» (Ленін)... «Маса робіць гэраічныя намаганьні ўзьняцца на вышыню навязаных ёй гісторыяй гіганцкіх сусьветных задач. І, як-бы не вялікі былі асобныя паражэньні, як не ашаламлялі нас патокі крыві і тысячы ахвяр—нішто і ніколі не параўнаецца па сваім значэньні з гэтым непасрэдным выхаваньнем мас і клясаў у ходзе рэвалюцыйнай барацьбы“ (Ленін).

Вялікі крывавы вурок, атрыманы пралетарыятам 22 (9) студзеня, канчаткова зруйнава ла веру ў цара. Перад працоўнымі масамі ва ўсёй нагаце прадстала гнюсная сыстэма самаўладзтва, якую трэба зламіць.

З гэтага моманту рост сацыялістычнай сьвядомасьці расійскага пралетарыяту ідзе сямімільнымі крокамі. Ня гледзячы на разгром першай рэвалюцыі, рабочая кляса гістарычна надзвычай шпарка аднавіла свае рэвалюцыйныя сілы. Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі бальшавікоў праз 12 год пасьля 22 (9) студзеня ён ужо расправіўся з самаўладзтвам, а яшчэ праз месяцы з капіталістамі.

Гэтымі фактамі вялікіх перамог рабочая кляса ў значнай меры абавязана таму глыбокаму рэвалюцыйна-сацыялістычнаму загартаваньню, якое ён атрымаў у студзеньскія дні 1905 г.

Памяць аб гэтых днёх у пралетарыята СССР ніколі не памрэ.

ПРЫ ПРАВЯДЗЕНЬНІ САВЕЦКАГА ДНЮ Ў ВЁСЦЫ РАСТЛУМАЧЫЦЬ КАЛГАСЬНІКУ І ПРАЦОЎНАМУ АДНААСОБНІКУ РАШЭНЬНІ ПЛЕНУМУ ЦК І ЦКК І ПРАМОВУ ТАВ. СТАЛІНА „АБ РАБОЦЕ НА ВЁСЦЫ“.

ЗАСЫПАЛІ НАСЕННЫЯ І СТРАХАВЫЯ ФОНДЫ І ПРЫСТУПІЛІ ДА РАМОНТУ ІНВЭНТАРУ.

(Сялюцкі сельсавет).

Да адзінага савецкага дню Сялюцкі сельсавет падыходзіць са значным зрухам у часьці арганізацыі падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Арганізавана 4 дэпутацкіх групы, у склад якіх увайшлі лепшыя калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі. Аднаасобны сэктар разьбіты на тры вучасткі, да кожнага з якіх прымацавана дэпутацкая група.

У выніку праведзенай работы па падрыхтоўцы да савецкага дню 15 студзеня завершона засыпка і сартыроўка насенных і страхавых фондаў. 12 студзеня канчаткова выкананы плян па бульбазагатоўках. Прыступлена да рамонту інвэнтару. Дрэнна тое, што з боку падшэфных прадпрыемстваў вельмі не значная аказваецца дапамога.

АРГАНІЗУЮЦЬ ЗАСЫПКУ НАСЕННЫХ І СТРАХАВЫХ ФОНДАЎ.

(Даўжанскі сельсавет).

Значна ўзьнялася работа дэпутацкіх груп па Даўжанскаму сельсавету ў сувязі з падрыхтоўкай да адзінага савецкага дню. Дэпутацкая група калгасу «Інтэрнацыянал» арганізавала збор насенных фондаў сярод калгасьнікаў. Сабрана бульбы 1392 клгр., ячменю—544 клгр. і інш. вернавых культур—64 клгр.

Дэпутацкая група калгасу «Шлях Ільліча» паставіла пытаньне на сходзе калгасьнікаў аб дапамозе калгасу «Сілач» у засыпцы насенных фондаў. Калгасьнікі калгасу «Шлях Ільліча» пазычылі калгасу „Сілач“ 2400 клгр. ячменю і 1600 клгр. бульбы. Зараз ва ўсіх калгасах арганізаваны па ініцыятыве дэпутацкіх груп збор насеньня сярод калгасьнікаў. Дэпутацкая група калгасу «Сілач» арганізуе актыў на выяўленьне кулацкіх элемэнтаў — зрыўшчыкаў калгаснага будаўніцтва.

ПРАЦОЎНЫЯ АДНААСОБНІКІ ЎСТУПАЮЦЬ У КАЛГАС.

(Рудакоўскі сельсавет).

Па раду калгасаў Рудакоўскага сельсавету разгорнута баявая падрыхтоўка да адзінага савецкага дню.

У калгасе імя Чарвякова дэпутацкая група правярае падрыхтаванасьць калгасу да сяўбы. Брыгадамі выяўлена, што ў калгасе не наладжаны ўход за пягавай сілай, не ацяплёны хлявы, не вытвараецца чыстка коняй. Дрэнна не эканомна расходуюцца кармы Брыгады садзейнічаюць сваёй работай таму, што ў калгасе імя Чарвякова ўжо завершоны абмалот, адначасова з малацьбой вытваралася і сарціроўка насеньня і засыпка насенных фондаў.

У калгасе імя Сталіна ў сувязі з разгортваньнем падрыхтоўкі да савецкага дню, паступіла 8 заяў ад беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў аб уступленьні ў калгасы, з іх ужо 4 прыняты.

Па калгасу «Дырыжабль», у сувязі з падрыхтоўкай да савецкага дню, скончаны абмалот. Пасеўпляны даводзяцца да брыгад.

ТУТ ДА САВЕЦКАГА ПАЛІТДНЮ НЕ РЫХТУЮЦЦА.

(Бабініцкі сельсавет).

Па Бабініцкаму сельсавету падрыхтоўка да адзінага савецкага дню не арганізавана. Дэпутаты і актыў слаба змагаюцца за завяршэньне загатовак і за своечасовую засыпку насенных і страхавых фондаў. Асабліва адстае аднаасобны сэктар.

На сёньняшні дзень па косаўскай, гаранскай і кардонскай сотням плян загатовак бульбы выкананы толькі на 35 процантаў. Па калгасам насенныя фонды поўнасьцю не засыпаны.

Арганізавана ўсяго адна дэпутацкая група ў калгасе імя МОПР, якая не разгорнула належнай масавай работы сярод калгасьнікаў.

Партыйная ячэйка, хаця і ставіла пытаньне аб савецкім дню на партсходзе, але практычна не праламляе ў жыцьцё пастанову партсходу. Бязьдзейнічае ў гэтых адносінах і сельсавет.

НА КОЖНЫМ ВУЧАСТКУ САЦБУДАЎНІЦТВА МАЦНІЦЬ НОВУЮ ФОРМУ РАБОТЫ САВЕТАЎ.

ЯК ПРАЙШОЎ ДРУГІ САВЕЦКІ ДЗЕНЬ ПА ГОРАДУ.

✽ У сувязі з правядзеньнем другога савецкага дню на скурзаводзе замацавалася да канца другой пяцігодкі 158 рабочых Сабрана 127 руб. на самалёт „Рабселькор-ударнік Віцебшчыны“, разгорнута работа па варашылаўскай эстафэце.

✽ На фабрыцы імя Лекерта паступіла 10 рабочых прапаноў, 450 рабочых замацавалася да канца другой пяцігодкі. Зволена 3 злосных прагульшчыка. Вынесена вымова галоўнаму механіку Мядзьведзеву за парушэньне працдысцыпліны.

✽ Вельмі дрэнна быў праведзен савецкі дзень на заводзе „Чырвоны мэталіст“. Дэпутацкай групай была вылучана брыгада для вывучэньня сваёй гаспадаркі, брыгады выявілі становішча, але практычна ня прынялі нічога для ліквідацыі тых прарываў, якія маюцца па засыпцы насенных фондаў, набору рабочай сілы і вывазцы гною. У калгасе не хапае 960 кілёграм аўсу, 49 тон бульбы.

✽ 27 актывістаў-ударнікаў завербавана у дэпутацкія групы на голкавай фабрыцы. 30 злосных прагульшчыкаў зволены з работы.

✽ Дэпутацкая група фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі“ вылучыла брыгаду з 10 рабочых для рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару ў сваёй гаспадарцы. Дырэкцыяй былі вылучаны коні для вывазкі гною, але галавацяп Воранаў (дырэктар калгасу) не скарыстаў гэтых коняй і гэтым самым сарваў вывазку гною. У калгасе не хапае на насеньне 10 тон раньняй бульбы, 8 цнт. ячменю.

✽ На фабрыцы імя Клары Цэткін зволена 24 прагульшчыка. Да канца другой пяцігодкі замацавалася 340 рабочых. У правядзеньні другога савецкага дню ўдзельнічала 300 рабочых.

Дырэктар Віц. аддз. Белкамунбанку—З. І. Валчок.

Не паўтараць мінулагодніх памылак у жылбудаўніцтве.

Плян жыльлёвага будаўніцтва 1932 году па гораду Віцебску ня выкананы. І гэта ня гледзячы на рад нават катэгарычных прапаноў з боку гаркому КП(б)Б і гарсавету. Чым гэта тлумачыцца?

У асноўным справа зводзіцца да таго, што з боку будаўнічых і будуючыхся арганізацый ня было ўдзелена патрэбнай увагі да таго, каб паводле дырэктывы партыі безагаворачна выканаць плян жыльбудаўніцтва Галоўная віна ляжыць, бязумоўна, на будаўнічых арганізацыях. Рад практычных прыкладаў адлюстроўваюць фактычнае становішча будаўніцтва. Так—па камунбуду соравай замацаваньня рабочай сілай не займаліся, у выніку з меўшыяся ў маі 827 рабочых засталося да канца году каля 160. Гэта зьяўляецца ў асноўным вынікам таго, што ў камунбудзе зусім ня цікавіліся справай палепшаньня бытавых умоў рабочых.

Дырэктывы партыі і ўраду аб безагаворачным зьніжэньні сабекошту будаўніцтва былі наогул запамятаны. Вось жывы факт. Па 5-му камунбуду перавыдаткавана на рабсілу 22000 руб., па будматар'ялах на 4900 р., па транспарту на 32000 руб., па адміністрацыйных выдатках 12500 руб., што складае звыш вызначаных па каштарысу сродкаў 43 процанты і гэта пры выкананьні будаўнічага пляну 1932 году па гэтаму дому ўсяго толькі на 83 процанты.

Хіба не характэрна, што ў разгар будаўніцтва былі спынены работы па 6-му дому гарсавету ў той час, калі ён быў забясьпечан цалкам будматар'яламі і фінсродкамі, прычым дом павінен быў ужо ў 1932 г. уступіць у эксплёатацыю Толькі дзякуючы катэгарычнаму паказаньню загадчыка Белканторы камунбуду т. Бротвіна ў сьнежані месяцы мінулага году ўноў былі пачаты работы на 6-м доме. Прыкладна гэтакае-ж становішча характэрна для ўсіх будаўніцтваў, вытвараемых камунбудам і зусім правільна падкрэсьліла камісія гарКК РСІ, што ў камунбудзе займаюцца ўсім чым угодна, але толькі ня справамі будаўніцтва.

А як нашы будуючыяся арганізацыі «змагаюцца» за зьніжэньне каштоўнасьці будаўніцтва, можна прывесьці і другі прыклад: Віцеспрамгас прадаў тэкстыльаб'яднаньню бярвеньні і выпісаў адпаведны рахунак. Загадчык будчасткі аб'яднаньня т. Кандрашук, ня прыняўшы лесаматар'ял, прапанаваў бухгальтэрыі аплаціць рахунак. Цікава, між іншым, і тое, што Леспрамгас у рахунку не адзначае пароды і сортнасьць лесу, а ад гэтага, бязумоўна, залежыць яго каштоўнасьць. У рахунку значылася «бярвеньні хвойныя», каштоўнасьць выпісана з разьліку як за сасну першага гатунку. Пры фактычнай праверцы аказалася, што ў гэтай партыі лесу маецца значны процант елі і пры гэтым 2-га і 3-га сорту, такім чынам лес павінен быў каштаваць значна танней.

Як-жа нашы бударганізацыі рыхтуюцца да будаўніцтва гэтага году?

Камунбуду для бягучага будаўніцтва патрабуецца каля 800 рабочых, фактычна маецца 150; Белбудканторы патрэбна 600, маецца 267 Ніводная з гэтых арганізацый візога ня робіць для забесьпячэньня будаўніцтва рабочай сілай. Ніхто з іх не праяўляе нават і прызнакаў падрыхтоўкі да прыёму рабочых у сэнсе забесьпячэньня агульнажыцьцём, сталоўкамі, разгортваньня самазагатовак і г. д.

Ствараецца ўражаньне, што кіраўніцтва будаўнічых арганізацый зусім расьцералася і ганебным вынікам гэтага зьяўляецца іх апартуністычныя адносіны да будаўніцтва. А між тым, аб'ём будаўніцтва ў гэтым годзе ня менш, чымся ў мінулым, ён патрабуе выключнай мабілізацыі ўсіх рабочых і ІТР вакол бязумоўнага скончаньня ўсяго бягучага будаўніцтва ў гэтым годзе. Практыка мінулага году дала шмат вурокаў таго, як ня сьлед будаваць. Змаганьне за сапраўдны гасправрахунак на кожным аб'екце будаўніцтва, належная расстаноўка сіл, зьмяншэньне адміністрацыйна гаспадарчых выдаткаў, штодзённае змаганьне за жорсткую эканомію кожнай капейкі, практычны ўдзел будуючыхся арганізацый у будоўлі і мабілізацыя ўсёй пралетарскай грамадзкасьці вакол справы жыльлёвага будаўніцтва павінны забясьпечыць безагаворачнае праламленьне ў жыцьцё рашэньня чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і цэлага рэду пазьнейшых дырэктыў партыі і ўраду па пытаньні найбольш эфэктыўнага скарыстаньня сродкаў на будаўніцтву з тым, каб гэтым самым забясьпечыць найбольшы прырост жыльлёвай плошчы для працоўных.

АБ ПЕРАДАЧЫ ПРАДПРЫЕМСТВАМ ВЫТВОРЧА-ПАЛІТЭХНІЧНЫХ ШКОЛ 1-га і 2-га КАНЦЭНТРУ.

ПАСТАНОВА АБ'ЯДНАНЫХ ПРЭЗЫДЫУМАЎ ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ АД 16-га СТУДЗЕНЯ 1933 Г.

На падставе пастановы СНК БССР ад 17 гасьнежня 1932 году, аб'яднаны прэзыдыум гарсавету і гарпрафсавету ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць аддзел нарасьветы перадаць, пералічаныя ў арт. 2-м гэтае пастановы арганізацыі, установы і прадпрыемствы, якія налічваюць ня менш 500 рабочых, у трохдзённы тэрмін прыняць вячэрнія вытворча-палітэхнічныя школы 1-га і 2-га канцэнтру, заставіўшы за аддзелам нарасьветы забесьпячэньне гэтых школ настаўнікамі, падручнікамі і мэтадычным кіраўніцтвам.

2. Прапанаваць ніжэйпаказаным прадпрыемствам, установам і арганізацыям з 1-га студзеня 1933 г. прыняць на свае ўтрыманьне вытворча-палітэхнічныя школы па аплаце настаўнікаў, гаспадарчых выдаткаў і інш.

1) Завод «Чырвоны мэталіст».
2) Акулярная фабрыка.
3) Фабрыка імя Лекерта.
4) Шчоткамбінат.
5) Панчошная фабрыка імя Клары Цэткін.
6) Белугыль.
7) Фабрыка «Прафінтэрн».
8) „ «Сьцяг індустр.».
9) Лесазавод імя «Правды».
10) Фанарны завод.
11) Мясцком воднікаў.
12) Фабрыка «Дзьвіна».
13) Групком будаўнікоў 22.
„ „ 87.
„ „ 34.
14) Учдор.
15) Саюз мэдсанпрацы.
16) „ каапэр. працаўнікоў.
17) „ нархарч.
18) МТС.
19) Біо-фабрыка.
20) Загатлес.
21) Панчошная фабрыка КІМ.

3. Вячэрнія вытворча-палітэхнічныя школы і кантынгэнт рабочых, навучаючыхся ў 1 і 2 канцэнтрах па ўсіх астатніх прадпрыемствах, установах і арганізацыях заставіць, у падпарадкаваньні аддзелу нарасьветы.

Для забесьпячэньня вячэрніх вытворчых школ з лікам рабочых менш 500, настаўнікамі, падручнікамі і інш., прапанаваць прафарганізацыям своечасова пералічаць на кантакарэнты рахунак аддзелу нарасьветы 4,9 проц. з агульнай сумы, якая паступае на ўтрыманьне прафарганізацый паказаных прадпрыемстваў.

Папярэдзіць прафарганізацыі аб недапушчэньні паслабленьня работы школ вячэрняй асьветы ў сувязі з перадачай іх прадпрыемствам, прыняўшы ўсе захады да поўнага ахопу навучаньнем усіх рабочых, а таксама забесьпячэньня іх тэхнічнымі сіламі для выкладаньня вытворча-тэхнічнага цыклу.

Старшыня гарсавету
КАРДАШЭНКА.
Старшыня гарпрафсавету
РАЗУМАЎ.

Непаваротлівасьць паглыбляе прарывы.

Ня гледзячы на тое, што віцебскі кінатэхнікум дабіўся некаторых зрухаў у сваёй працы, ганебныя прарывы канцаткова там не ліквідаваны.

За апошні час пакінула тэхнікум 3 студэнты. Палітвыхаваўчая работа сярод студэнтаў адсутнічае. Кінотэрэст адпусьціў 4000 рублёў для арганізацыі сталовай пры тэхнікуме, але з-за непаваротлівасьці адміністрацыі сталовая не арганізавана і грошы перададзены для арганізацыі рабфаўскай сталоўкі.

Выкладаньне грамадазнаўства вядзе дырэктар тэхнікуму тав. Шапавалаў. Ён часта не зьяўляецца на лекцыі і зрывае заняткі. З той прычыны, што тэхнікум ня мае сталых выкладчыкаў, там надта часта зрываюцца лекцыі. Сацспаборніцтва паміж настаўнікамі адсутнічае.

Аздаравіць становішча ў тэхнікуме—важнейшая задача партячэйкі і культпропу гаркому.

Б.

ДЗЯРЖЦЫРК. СЁНЬНЯ, 22 студзеня,

2 ГРАНДЫЁЗНЫХ ПРАДСТАЎЛЕНЬНЯ

Новыя гастролі 4 ВАРАНЦОВЫ (эксцэнтрыкі), ГАРТВЕЛЬ (турністы) і шмат іншых новых нумараў.

Пачатак дзённага—а 2 й гадз., вячэрняга—а 8½ гадз увечары. Па калектыўным заяўкам скідка ад 25 да 40 процантаў.

Прапануецца рабочым, працаваўшым на АСІНТОРФУ

ў сэзон 1932 году і не атрымаўшых разьліку, зьявіцца у гарпрафсавет (Палац працы, пакой № 23) для атрыманьня разьліку.

Выплата будзе вытварацца 21, 22 і 23 га студзеня з 10—2 гадзін дню і з 6—8 гадзін увечары.

ГАРПРАФСАВЕТ.
ДЫРЭКЦЫЯ АСІНТОРФУ.

68—2—1

ПЛЯН правядзеньня ПЕРАВЫБАРАЎ ЖАКТ'аў па гор. Віцебску.

№№ былых ЖАКТ'аў.	№№ утвораных ЖАКТ'аў.	Месца правядзеньня перавыбарч. сходу.
Першы дзень перавыбараў 23 студзеня, а 7 гадз. увечары.		
1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8	1	Клюб камгасу.
9, 10, 11, 12	2	Палац працы, пакой № 11.
13, 14, 15, 16	3	Клюб асьветнікаў.
43, 49, 58, 62	10	Клюб «Прафінтэрн».
44, 45, 46, 57, 59	11	Клюб саматужнікаў.

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Да ўсіх падпішчыкаў на газэты.

Падпіска на ўсе газэты на люты месяц і да канца году вытвараецца па новым павышаным цэнам: газэты «ПРАВДА» і «ИЗВЕСТИЯ» па 3 руб. у месяц, астатнія цэнтральныя газэты, якія выходзяць у месяц 24—25 разоў—па 2 р. 50 коп.

Белнацменаўскія газэты: „ЗЬВЯЗДА“, „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“, „РАБОЧИЙ“, „ОКТЯБРЬ“ (яўр. газэта)—па 2 р. 40 к. у месяц, „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“—1 р. 20 кап., „КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ“—75 к., „РАБСЕЛЬКОР“, „СЕЛЬГАСРАБОТНІК“, „НА ВАРЦЕ“ „ОРКА“ (польгаз.), „РАЎДОНАЙСІС-АРТОЯС“ літоўская газ.), „ЮНГЭР АРБЭЙТЭР“ (яўр газэта)—па 60 к у мес. Літаратурная газэта—30 к., „ПІАНЭР БЕЛАРУСІ“ і „ЮНГЭР ЛЕНІНЕЦ“ (яўр. газэта)—па 18 к.

Усе калектыўныя і індывідуальныя падпішчыкі павінны да 1 лютага даўнесьці ў віцебскае газэтнае бюро пры пошце, або ў адпаведныя паштовыя гэнцтвы ў сельсаветах прылічваемую з іх розьніцу між старымі і новымі цэнамі на выпісаныя газэты на люты—зьнежань 1933 г.

Калі да 1 лютага г. г. ня будзе зроблены пераразьлік за падпіску на ўсе газэты люты—сакавік, то заказ ня будзе выкананы па старым цэнам і газэты дастаўляцца такім падпішчыкам ня будуць.

Адпаведна і розьнічныя цэны на кожны нумар газэты павышаецца—10 кап. за экзэмпляр.

Гарбюро Белсаюздруку.

На 25-е студзеня, а 7-й гадзіне ўвечары, у клюбе саматужнікаў, па Валадарскай вул., ВІЦГАРФА СКЛІКАЕ АГУЛЬНЫ СХОД САМАТУЖНІКАЎ АДЗІНОЧАК па пытаньні аб льготах саматужнікам па падатках на 1933 год.

74—3—1 ГАРФА.

Загаданы № 12. Друкарня „Адметкіра“ Баль... Тыраж 8.500 экз.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 21 | СЕРАДА, 25 студзеня 1933 г. | № 21

ПЕРШЫ САВЕЦКІ БЛЮМІНГ ПУШЧАН.

МАКЕЕЎКА, 21-га студзеня. Сёньня, а 2 гадз. дню, у награвацельны калодзеж першага савецкага блюмінгу апушчаны балванкі д л я награваньня. Людзі расстаўлены па мясцох. Усе мэханізмы работаюць бесьперабойна.

ПЕРШАЯ БАЛВАНКА БУДЗЕ АБЖАТА БЛЮМІНГАМ СЁНЬНЯ ЎНАЧЫ. („Правда").

З КАНВЭЙЕРА СТЗ ЗЫХОДЗІЦЬ 50-ТЫСЯЧНЫ ТРАКТАР.

СТАЛІНГРАД, 21 га студзеня. Калектыў сталінградзкага трактарнага заводу імя Дзяржынскага павысіў тэмпы выпуску трактароў. У апошнія дні з вялікага канвэеру заводу зыходзіць штодзень звыш 100 трактароў. 20-га студзеня з канвэера зьнята 116 трактароў.

СЁНЬНЯ ЗАВОД ВЫПУСКАЕ ТРАКТАР № 50 000.

Пяцьдзесят тысяч сталінградзкіх трактароў (1/5 усяго трактарнага парку СССР) работаюць на сацыялістычных палёх. („Правда").

МАГУТНАЯ ЗБРОЯ ЎМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ.

Надрукаваная ў «Правде» 20 студзеня *) пастанова Савету Народных Камісараў ССР і Цэнтральнага Камітэту партыі «АБ АБАВЯЗКОВАЙ ПАСТАЎЦЫ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ КАЛГАСАМІ І АДНААСОБНЫМІ ГАСПАДАРКАМІ» мае аграмаднае гаспадарча-палітычнае значэньне. Замест раней існаваўшай дагаворнай (кантрактыйнай) сыстэмы загатовак збожжавых культур устанаўліваецца цяпер новы парадак, згодна якому калгасьнікі і аднаасобнікі атрымліваюць цьвёрдыя пагэктарныя нормы здачы збожжа дзяржаве з ураджаю 1933 году па ўстаноўленым дзяржаўным цэнам. Абавязацельствы гэты набываюць сілу ПАДАТКУ.

Пастанова Савнаркому і ЦК партыі—повае надзвычайна важнае мерапрыемства ў справе далейшага ўздыму ўраджайнасьці і пашырэньня пасеўных плошчаў збожжавых культур. Яно павінна стаць магутнай зброяй у арганізацыі і пасяпаховым правядзеньні пасеўнай кампаніі. Гэта пастанова стане буйным фактарам далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Яно непарыўна зьвязана з усімі папярэднімі рашэньнямі партыі, накіраванымі на далейшы ўздым сельскай гаспадаркі. Вопыт паказаў, што гэты-ж прынцып—мацнячы сілу падатку цьвёрдыя нормы здачы,—пакладзены у асновы пастаноў Савнаркому і ЦК «Аб мясазагатоўках», «Аб загатоўках масла, мяснка і сыру», упаўне апраўдае сябе і грае станоўчую ролю ў росьце стада і ў выкананьні абавязацельстваў калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў перад пралетарскай дзяржавай.

Пастанова Савнаркому і ЦК партыі абавязвае мясцовыя арганізацыі ўручыць не пазьней 15 сакавіка кожнаму калгасу і аднаасобніку абавязацельствы па здачы збожжа з дакладным паказаньнем культур і тэрмінаў здачы. Адгэтуль калгасныя гаспадаркі будуць ведаць загадзя да севу, колькі яны павінны здаць (прадаць) дзяржаве збожжавых культур. Гэта абавязацельства будзе вылічацца для калгасу і аднаасобніка з фактычнага пасеву азімых і ЎСТАНОЎЛЕНАГА пляну пасеву яравых. КОЖНЫ КАЛГАС, КАЛГАСЬНІК І АДНААСОБНІК БУДУЦЬ ЗАЦІКАЎЛЕНЫ Ў ПОЎНЫМ ВЫКАНАНЬНІ ЎСТАНОЎЛЕНАГА ПЛЯНУ ВЕСНАВОГА СЕВУ, БО РАЗЬМЕР ЦЬВЁРДАГА АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА АБ ЗДАЧЫ ХЛЕБА ЎЖО ВЫЗНАЧАНЫ ПАСТАНОВАЙ. Усялякі недасеў СКАРАЦІЦЬ тую колькасьць хлеба, якая магла б застацца ў іх пасьля выкананьня дзяржаўных абавязацельстваў. Наадварот, перавыкананьне пляну сева зернавых культур ЗНАЧНА ПАВЯЛІЧВАЕ даходы калгасьнікаў і аднаасобных гаспадарак.

У сувязі з гэтым, калгасьніку становіцца яснай пэрспэктыва разьвіцьця калгасу. Гэта дае магчымасьць лепш падрыхтавацца да севу, ўзьняць ініцыятыву і зацікаўленасьць кожнага калгасьніка ў росьце зернавой гаспадаркі. Кожны калгасьнік павінен цяпер ведаць, што змагаючыся за плян веснавога севу, паляпшаючы арганізацыю працы ў калгасе, праводзячы агратэхнічныя мерапрыемствы, змагаючыся за захаваньне грамадзкай уласнасьці, ён гэтым самым дамагаецца, каб у яго пасьля выкананьня абавязацельстваў у адносінах да дзяржавы засталося больш хлеба.

Чым лепш калгас засеіць, чым лепш ён апрацуе глебу, чым менш будзе страт, чым хутчэй і лепш будзе ўбраны і абмалочаны хлеб, чым хутчэй ён выканае цьвёрдыя, загадзя вядомыя яму, абавязацельствы, ТЫМ БОЛЬШ ХЛЕБА ЗАСТАНЕЦЦА Ў РАСПАРАДЖЭНЬНІ КАЛГАСУ І Ў АСАБІСТЫМ КАРЫСТАНЬНІ КАЛГАСЬНІКАЎ.

Гэта пастанова мае выключнае значэньне для палепшаньня плянаваньня і арганізацыі сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Тав. Сталін на апошнім плэнуме сказаў: „КАЛГАС ЁСЬЦЬ БУЙНАЯ ГАСПАДАРКА. АЛЕ БУЙНУЮ ГАСПАДАРКУ НЕЛЬГА ВЕСЬЦІ БЯЗ ПЛЯНУ. БУЙНАЯ ГАСПАДАРКА Ў ЗЕМЛЯРОБСТВЕ, АХАПЛЯЮЧАЯ СОТНІ, А ІНАГДЫ І ТЫСЯЧЫ ДВАРОЎ, МОЖА ВЕСЬЦІСЯ ТОЛЬКІ Ў ПАРАДКУ ПЛЯНАВАГА КІРАЎНІЦТВА. БЯЗ ГЭТАГА ЯНА ПАВІННА ЗАГІНУЦЬ І РАЗВАЛІЦЦА". Устанаўліваючы каляндарныя тэрміны пастаўкі хлеба, рабоча-сялянская дзяржава гэтым самым узьдзейнічае на калгасы і ў сапраўдным ПЛЯНАВАГА вядзеньня гаспадаркі, лепшай арганізацыі працы, УСІХ працэсаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Гэта—цьвёрды падмурак для арганізацыі работы ў калгасе, для яго гадавога вытворчага пляну. Тэрміны здачы хлеба павінны легчы ў аснову складаемых і абгаварваемых зараз на мясцох гадавых вытворчых плянаў калгасаў.

Пастанова Савнаркому і ЦК партыі КАТЭГАРЫЧНА ЗАБАРАНЯЕ МЯСЦОВЫМ ОРГАНАМ УЛАДЫ ДАПУСКАЦЬ У ЯКОЙ БЫ ТО НІ БЫЛО ФОРМЕ СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ. Гэта паказаньне гарантуе калгасы, добрасумленна выконваючыя свае абавязацельствы перад дзяржавай, ад намылак тых мясцовых арганізацый, якія йшлі па лініі найменшага супраціўленьня і парушалі прынцып—хто больш і лепш работае, той больш атрымлівае. З прычыны гэтага часта выігрываў той калгас, які не выконваў сваіх абавязацельстваў. Перадавы-ж калгас, акуратна выконваўшы свае абавязацельствы, заставаўся інагды пакрыжаваным. Пастанова падкрэсьлівае пагэтаму, што «усе зьлішкі хлеба пасьля выкананьня абавязацельстваў, здачы дзяржаве збожжа застаюцца у поўным распараджэньні саміх калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў».

Пастанова, апрача таго, што яна ў цэлым узмацняе зацікаўленасьць калгасьнікаў ва узьняцьці ўраджайнасьці і пашырэньні севу зернавых, падкрэсьлівае, што калгасы, даючыя збожжа дрэннай якасьці, павінны будуць здаваць БОЛЬШ хлеба. Здача збожжа прарослага, затхлага, ня будзе залічвацца ў выкананьне абавязацельстваў. Такім чынам, гэта мерапрыемства спрыяе ўзьняцьцю ЯКАСЬЦІ вытвараемага збожжа наогул.

Дзяржава ўстанаўлівае для калгасаў, абслугоўваемых МТС, меншы разьмер пастаўкі збожжа, КАБ ЯНЫ МАГЛІ АПЛАЧВАЦЬ НАТУРАЙ МТС ЗА ЯЕ РАБОТУ Ў КАЛГАСЕ (пахата, сеў, уборка і г. д.)

За пэрыяд першай пяцігодкі сельская гаспадарка атрымала больш 120 000 новых трактароў, на 1 600 млн. рублёў сельска гаспадарчых машын, за гэты час арганізавана 2 446 машынна-трактарных станцый, вёска атрымала значную колькасьць аўтамабіляў. З кожным годам павялічваецца завоз прамтавараў у вёску. Рабочая клясa, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі напружвае ўсе сілы для палягчэньня працы мільёнаў калгасьнікаў, для далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі. ДЗЯРЖАВА УПРАВЕ ПАГЭТАМУ ПАТРАБАВАЦЬ АД УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ БЕЗАГАВОРАЧНАГА ВЫКАНАНЬНЯ СВАІХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ.

Новыя стымулы нельга рэалізаваць, палагаючыся на самацёк. Патрэбна ўпартая работа і бальшавіцкая арганізацыя, каб на аснове пастановы СНК і ЦК партыі дабіцца далейшага ўздыму ў сельскай гаспадарцы. Патрэбна ўпартая барацьба з клясавымі ворагамі, якія спрабуюць павярнуць назад кола гісторыі. Гэта раз. І па другое, інтарэсы рабоча-сялянскай дзяржавы павінны быць поўнасьцю і цалкам забясьпечаны ва што б то ні стала.

ВЫКАНАНЬНЕ ЦЬВЁРДЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПА ЗДАЧЫ ЗЯРНА ДЗЯРЖАВЕ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ПЕРШАЧАРГОВЫМ АБАВЯЗКАМ КОЖНАГА КАЛГАСУ І АДНААСОБНАЙ ГАСПАДАРКІ. Здача павінна быць вытварана з першых абмалотаў і ў дакладна устаноўлевыя каляндарныя тэрміны. Замена харчовых культур—пшаніцы і жыта—фуражнымі і крупянымі не дазваляецца. Гэтак сама-ж забаронена замена пшаніцы, якой-бы то ні было іншай культурай.

Партыйныя арганізацыі, не зразумеўшыя ў радзе раёнаў новай абстаноўкі, склаўшайся ў сувязі з калгасным гандлем хлеба, не павінны паўтараць больш памылак бягучай хлебазагатоўчай кампаніі, карэньні якіх ускрыты тав. СТАЛІНЫМ у яго прамове „АБ РАБОЦЕ У ВЁСЦЫ". Партыйныя арганізацыі і палітаддзелы МТС павінны таксама шырока растлумачыць калгасьнікам, што „КАЛГАСНЫ ГАНДАЛЬ ХЛЕБАМ БУДЗЕ ДАЗВАЛЯЦЦА ТОЛЬКІ ПАСЬЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ЎСТАНОЎЛЕНАГА НА ПАДСТАВЕ ГЭТАЙ ПАСТАНОВЫ ПЛЯНУ ХЛЕБАЗАГАТОВАК У ЦЭЛЫМ ПА РЭСПУБЛІЦЫ, КРАЮ, ВОБЛАСЬЦІ І ПОЎНАЙ ЗАСЫПКІ, ПАСЬЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ХЛЕБАЗАГАТОВАК, НАСЕННЫХ ФОНДАЎ".

Пастанова Савета Народных Камісараў і ЦК партыі ставіць вельмі рэзка пытаньне аб СВАЕЧАСОВЫМ выкананьні абавязацельстваў калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі. У адносінах да калгасаў і аднаасобнікаў, якія не выканаюць абавязацельстваў, будуць дапасаваны меры адміністрацыйнага спагнаньня. Гэткія калгасы будуць падвергнуты грашоваму штрафу ў разьмеры рыначнага кошту незданай колькасьці зернавых культур і звыш гэтага да іх будзе прадпісана патрабаваньне аб датэрміновым выкананьні ўсяго гадавога абавязацельства, падлягаючага спагнаньню ў бясспрэчным парадку. У адносінах аднаасобнікаў, ня выконваючых абавязацельстваў, будзе дапасоўвацца 61 арт. Крымінальнага кодэксу.

У мэтах забясьпечаньня перавагі калгасьніка перад аднаасобнікамі рашэньне СНК і ЦК устанаўлівае для аднаасобных гаспадарак на 5—10 ПРОЦАНТАЎ БОЛЬШ ВЫСОКІЯ ПАГЭКТАРНЫЯ НОРМЫ хлебаздачы, чымся для калгасьнікаў.

У рэзультаце посьпехаў суцэльнай калектывізацыі і росту пасеўных плошчаў таварнасьць сельскай гаспадаркі ў апошнія гады значна ўзрасла. Па меры далейшага ўмацаваньня калгасаў, узмацненьня аховы сацыялістычнай уласнасьці, сацыялістычнага перавыхаваньня калгасьнікаў, таварнасьць калгасу будзе расьці з году ў год, рост вытворчасьці збожжа будзе ісьці ў набачаных яшчэ разьмерах.

Тав. СТАЛІН у сваім праграмным выступленьні аб рабоце у вёсцы ускрыў новыя манэўры клясавых ворагаў. Пастанова СНК і ЦК партыі—мацнейшая зброя ў руках калгасных мас, у барацьбе з рэшткамі куладтва, у руках камуністаў супроць апартуністаў і жулікаў з партбілетам, за ўмацаваньне новага калгаснага ладу.

Гэтай пастановай дадзен новы стымул для вытворчасьці новых мас сельска-гаспадарчых прадуктаў, для ўздыму добрабыту працоўных гораду і вёскі.

Пастанова СНК і ЦК—МАГУТНАЯ ЗБРОЯ ДЛЯ ПАСЬПЯХОВАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ І РАЗВАРОТУ ВЫТВОРЧЫХ СІЛ КАЛГАСНАЙ ВЁСКІ.

(З перадавой «Правды»).

*) Глядзі «Віцебскі пралетары» ад 24 студзеня 1933 г.

ПРАЛЕТАРЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ!

СЛУХАЙЦЕ ЗАКЛІК РАБОЧЫХ СКУРАНАГА ЗАВОДУ!

Падбярэм для кіраўніцтва калгасаў праверапыя бальшавіцкія кадры, накіруем наша пралетарскае шэфства на арганізацыйнае ўмацаваньне калгасаў, на ператварэньне іх у сапраўды бальшавіцкія.

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ, СЛУЖАЧЫХ, ІТР ГОРАДУ ВІЦЕБСКУ.

Абгаварыўшы гістарычную прамову т. Сталіна „аб рабоце у вёсцы", якая дае ясны і глыбокі бальшавіцкі аналіз становішча у вёсцы на данным этапе, які ў сваіх 5 пунктах ня толькі выкрыў формы і мэтады барацьбы, якую вядзе з намі клясавы вораг—кулак і яго агэнтура ў партыі і рабочай клясы, але і слабае месца нашай працы ў справе арганізацыі калгасаў і іх бальшавізацыі. Улічваючы паказаньні тав. Сталіна, што „зараз задача стаіць у тым, каб узмацніць калгасы арганізацыйна, вышыбіць адтуль шкодныя элементы, падабраць сапраўдныя, праверапыя бальшавіцкія кадры для калгасаў і зрабіць калгасы сапраўды бальшавіцкімі" і ўсьвядоміўшы ўсю адказнасьць, якая кладзецца на рабочую клясу за ператварэньне ўсіх калгасаў у сапраўдна бальшавіцкія, мы зьвяртаемся да ўсіх рабочых-ударнікаў Віцебску з заклікам:

Выходзячы з паказаньняў тав. Сталіна, што: „справа перш за усё у тым, хто стаіць на чале калгасаў і хто кіруе імі", мы—ударнікі скуранага заводу лічым неабходным абвясьціць заклік рабочых ударнікаў—добраахвотнікаў для паездкі у вёску на сталую працу ў калгасы, саўгасы, сельсаветы і іншыя вучасткі, куды патрабуе партыя і савецкая улада і з нашых радоў вылучаем лепшых барацьбітоў за пяцігодку таварышоў: Шэўчанка, Каца, Шкурава, Пэскіна і Дудкіна.

Прызнаючы, што наша работа па шэфству над вёскай яшчэ дагэтуль нездавальняюча, мы просім партыйна-прафсыйныя арганізацыі абвясьціць месячнік агляду і ўзмацненьня працы шэфскіх арганізацый.

Мы вылучаем брыгаду рабочых у складзе: аднаго сьлюсара, аднаго каваля, аднаго столяра і аднаго шорніка па рамонту інвэнтару ў падшэфным калгасе.

Мы вылучаем таксама брыгаду работнікаў бухгальтэрыі і спэцыялістаў па арганізацыі працы і нарміраваньні для дапамогі калгасам у наладжваньні рахункаводзтва і арганізацыі працы.

Ад дырэкцыі мы патрабуем узяць двух рахункаводаў з падшэфных калгасаў на фабрыку для пратаджэньня з імі практычнай вучобы па спэцыяльнасьці на працягу 2-х месяцаў.

Мы лічым неабходным зараз-жа арганізаваць брыгады па збору попелу і ўтыльёму для падшэфных калгасаў.

Для растлумачэньня пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК і гістарычнай прамовы тав. Сталіна і апошняй пастановы аб абавязковай здачы дзяржаве збожжа мы вылучаем брыгаду з 3-х асоб у складзе адказных работнікаў парткалектыву, фабкому і КСМ.

Фабкому мы даручаем прыняць усе захады для аказаньня дапамогі падшэфным калгасам у арганізацыі ў кожным з іх чырвонага куту, снабдзіць іх адпаведнай літаратурай, устанавіць рэгулярнае абслугоўваньне калгасаў культурнымі работнікамі заводу.

Мы абавязваем фабком і рэдкалегію заводзкай газэты дапамагчы падшэфным калгасам у справе арганізацыі і рэгулярнага выпуску калгасных насьценгазэт. Для ўзаемнага азнаямленьня з працай заводу і калгасаў кожную дэкаду ўтварыць а б м е н насьценгазэт і практыкаваць рэгулярныя даклады аб працы калгасаў і заводу на агульных сходах і рабочых і калгасьнікаў.

Лічым неабходным праз 2 дэкады заслухаць на агульным сходзе рабочых справаздачу фабкому аб ходзе выкананьня намечаных мерапрыемстваў.

Мы упэўнены, што наш заклік знойдзе водгук у шырокіх рабочых масах Віцебску і што ўдарнікі Віцебску і зараз, як заўсёды, пакажуць, што ўзятыя на сябе абавязкі яны, пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі, выканаюць з гонарам.

Няхай жыве тав. Сталін—любімы правадыр рабочай клясы, сусьветнага пралетарыяту!

Няхай жыве ЦК УсеКП(б)—арганізатар бальшавіцкіх перамог.

Па даручэньню канфэрэнцыі ўдарнікаў:
ПРЭЗЫДЫЎМ—Бахрах, Шэйнштэйн, Лікер.

ЛЕПШЫЯ ЎДАРНІКІ: Блахін (вытворчы стаж 20 гад), Васільеў (40 год), Пэскін (14 год), Шульман (16 год), Кац (10 год), Шкураў (13 год), Шэўчанка (16 год), Жук (19 год), Тамілін (12 год), Дудкін (16 год).

НА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЗАГАТОВАК МАЛАКОПРАДУКТАЎ ПРАВЯРАЕЦЦА ЗДОЛЬНАСЬЦЬ ГАРАДЗКІХ І СЕЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЗМАГАЦЦА ЗА ПЕРАБУДОВУ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З НОВЫМІ ЗАКОНАМІ.

Хто дазволіў Райспажыўсаюзу, Рудакоўскаму, Ялагінскаму і Шумнянскаму сельсаветам мяркаваць, што законам аб загатоўках, маючых моц падатку, зьнята барацьба за АРГАНІЗАЦЫЮ загатовак.

ЗАГАТОЎКАМІ МАЛАКА НІХТО НЯ КІРУЕ.

У свой час мы зьмяшчалі матар'ял аб ходзе загатовак масла і малака на 1933 год. Выкрывалі прычыны маруднага яго паступленьня. Здавалася-б, што наш сыгнал павінен быў даць адпаведны пералом у бок палепшаньня работы па загатоўках малака. Здавалася-б, што загатоўкі збожжа, бульбы і іншых відаў сельска-гаспадарчай прадукцыі павінны былі навучыць нашы загатоўчыя арганізацыі, што патрэбна арганізоўваць загатоўкі. На справе ж гэтага няма. Паступленьне малака па раёну праходзіць вельмі нездавальняюча. На 20 студзеня месячны плян выкананы толькі на 15,8 проц. Чаму такое ганебнае выкананьне пляну загатовак малака?

Пачнем з сельсаветаў. Большасьць з іх палічылі сваёй справай толькі давесьці самаабавязацельствы да калгасьнікаў і аднаасобнікаў, запамятаўшы аб арганізацыі загатовак, запамятаўшы аб клясавай барацьбе і аб сабатажы кулака.

Даўжанскі сельсавет у студзені павінен здаць 6 121 літр малака. Гэтую лічбу кіраўнікі сельсавету добра ведаюць, але ж нічога ня робяць для таго, каб выканаць яе. Наогул, у Даўжанскім сельсавеце загатоўкі выпалі з поля зроку кіраўнікоў сельсавету і сельСТ. Будзь варта такое становішча, калі калгасьнікі, аднаасобнікі і нават і. пьвёрдазаданьнікі яшчэ не прыступілі да выкананьня сваіх самаабавязацельстваў. А ў Шумнянскім сельсавеце і калгасы не прыступалі да загатовак. Малако прадаюць на рынках. Зьмяшчаемая сёньня зводка ясна паказвае на поўную бязьдзейнасьць кіраўнікоў сельсавету і сельСТ у выкананьні загатовак малака.

Работнікі сельСТ арганізацыяй загатовак малака не займаюцца. Большасьць з іх нават ніколі ні бываюць у калгасах і вёсках (сельСТ Даўжанскі, Шумнянскі, Бараўлянскі, В. Лётчанскі і Старасельскі).

Што-ж у гэтай справе робяць райспажыўсаюз і Белкаапмалако? Праўда, райспажыўсаюз паслаў сваіх прадстаўнікоў у сельсаветы, але справа ў тым, што гэтыя прадстаўнікі бязьдзейнічаюць і райспажыўсаюз іх работу не кантралюе. Людзі сядзяць у сельсаветах, атрымліваюць камандыровачныя і адпачываюць (Стальмакоў, Юшкевіч, Кандрацьеў, Хэйфец). А Белкаапмалако і гэтага не зрабіла. Ніводнага прадстаўніка ў сельсаветы не паслана і ў арганізацыі загатовак гэта арганізацыя ня ўдзельнічае. Не кіруе гэтай справай і гарсавет.

На сёньняшні дзень і прыёмка малака не арганізавана. Вось факты: на Гарадоцкім шасэ ёсьць зьліўны пункт Белкаапмалако. На гэты пункт здаюць малако Міхалёўскі і Бараўлянскі сельсаветы. 23 студзеня калгасьнікі прывязьлі малако, але «работнікі» пункту ня прынялі малако пад відам «адсутнасьці тары». Малако перамёрзло. Калгасьнікі, праўда, па распараджэньні райспажыўсаюзу склалі акт на гэтых працаўнікоў пункту. Аднак, справа ня ў акце, справа ў тым, што загатоўчыя арганізацыі нават ня прымаюць і тое малако, якое ідзе да іх... самацёкам. Прасьцей гаворачы, загатоўчыя арганізацыі сваімі адносінамі зрываюць загатоўкі малака.

Тарай зьліўныя пункты не забясьпечаны. Белкаапмалако ў гэтых адносінах праяўляе паўнейшую бязьдзейнасьць.

Так далей весьці загатоўкі нельга. Неабходны рэзкі пералом. Загатоўкі малака трэба арганізаваць. Трэба ўлічыць вурокі загатовак збожжа і на гэтых вуроках вучыцца, як трэба арганізоўваць дзяржаўныя загатоўкі ўсіх відаў. Трэба з усёй рашучасьцю націснуць на кулацка-замоўную частку, якая сабатуе загатоўкі малака і спагнаць з іх зараз-жа. Арганізаваць работу так, каб кожны калгасьнік, працоўны аднаасобнік выканаў свае абавязацельствы поўнасьцю і ў тэрмін. Сельсаветы абавязаны прымаць рэпрэсыўныя меры да злосных нездатчыкаў накладаньнем штрафаў і прыцягненьнем іх да судовай адказнасьці.

Райспажыўсаюз, гарсавет і Белкаапмалако павінны перабудаваць сваю работу каб ліквідаваць прарыў, які стварыўся на першым этапе загатовак малака і ў далейшым арганізавана восьці гэты адказны вучастак работы.

Толькі пры ўмелай арганізацыі загатовак малака, пры спалучэньні масавай работы сярод калгасьнікаў, працоўных аднаасобнікаў з націскам на кулака, студзеньскі плян будзе выкананы, а выканаць яго абавязаны бо нам ня даў ніхто права зрываць дзяржаўныя плыны.

Сурганаў.

ПАСТУПЛЕНЬНІ МАЛАКА ПА ВІЦЕБСКАМУ РАЕНУ на 20-е студзеня (у літрах)

НАЗВА СЕЛЬСАВЕТАЎ	Заданьне на студзень	Выкананьне	Процант выкананьня
Ялагінскі	7 320	197	2
Міхалёўскі	6.535	1.[illegible]50	26
Рудакоўскі	9.175	263,5	2
Даўжанскі	6.[illegible]	1.439	23
В.-Лётчанскі	7.258	317	4
Рудніцкі	8 825	1.167	13
Старасельскі	7 473	2 618	35
Віцебскі	5 688	798	14
Шумнянскі	8.913	—	0
Мікалаёўскі	7.777	1.971,5	25
Замасточкі	8.460	844	9
Бабініцкі	9.985	1.272	12
Машканскі	8 871	2 449,5	27
Сяльцкі	7.501	2.307,5	30
Бараўлянскі	7.026	1.165	16
РАЗАМ	116.922	18.561,5	15

Ад калгасаў МТФ паступіла 8.195 літраў (зад 46.893 літра і 87 клгр. тапленага масла), ад іншых калгасаў паступіла 5 145,5 літраў (заданьне—12 540). Калгасьнікі МТФ здалі 1.890 літраў (плян—11 052 літра і 74 клгр. тапленага масла), астатнія калгасьнікі—1.038 літраў (заданьне—6 470 літраў і 26 клгр. масла). Аднаасобнікі здалі 1.910 літраў (заданьне 31.335 літраў і 1[illegible] клгр. масла). Пьвёрдазаданьнікі здалі 375 літраў, а заданьне на студзень месяц—3.030 літраў і 24 клгр. тапленага масла.

Масла паступіла ад Машканскага сельсавету 60 клгр., ад Мікалаёўскага 89 клгр.

УСІМ СЭКРАТАРОМ РАЙКОМАЎ, СТАРШЫНЯМ РВК.

Пастанова СНК і ЦК аб маслязагатоўках нами ня выканана. Абавязацельствы аб здачы малака не даведзены, сетка малакапрыёмных пунктаў не арганізавана, загатовак малака няма, увага партыйных, савецкіх арганізацый і грамадзкасьці не мабілізавана. Такое становішча тлумачыцца бязьдзейнасьцю загатоўчага апарату, адсутнасьцю кіраўніцтва кантролю і дапамогі з боку райкому і райвыканкому. Прапануем 23 студзеня скончыць давядзеньне абавязацельстваў аб здачы малакапрадуктаў, абавязаўшы загатоўшчыкаў пусьціць у эксплятацыю усе заводы і пункты; 24 студзеня тэлеграфаваць зводку аб колькасьці даведзеных абавязацельстваў у сэктарыяльным разрэзе, у ную пяцідзёўку заслухоўваць загатоўшчыкаў аб ходзе загатовак, забясьпечыць падачу загатоўшчыкамі пяцідзённых тэлеграфных звестак пра ход загатовак. Аб прынятых мерах тэлеграфуйце.

ЦК Рыск
СНК Галадзе

В. ВОЛЬСКІ.

ПРА РЭЦЫДЫВЫ НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМУ Ў ТВОРЧАСЬЦІ МАСТАКА МІНІНА.

Разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва і ліквідацыя варожых клясаў выклікае абвастрэньне клясавай барацьбы і пэўную актывізацыю антысавецкіх элемэнтаў. Разгромленыя нацыянал дэмакратычныя элемэнты — агэнты кулацка-капіталістычнай контррэвалюцыі—зноў робяць спробу аднавіць сваю шкодніцкую, антысавецкую дзейнасьць на паасобных вучастках культурнага будаўніцтва. Актывізацыя гэтых элемэнтаў, неадрыўна зьвязаная з абвастрэньнем клясавай барацьбы, пра што гаварыў 23 сьнежня 1932 г. у сваім дакладзе на партсходзе Менскае арганізацыі сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Гікало, патрабуе ўзмацненьня клясавай пільнасьці, патрабуе рашучага змаганьня на два франты—супроць усіх ворагаў ленінскай нацыянальнай палітыкі, супроць усіх клясава-варожых праяў і вылазак на паасобных вучастках мастацкага фронту.

Пра актывізацыю клясава-варожых тэндэнцый, пра пэўныя рэцыдывы нацыянал дэмакратычных канцэпцый у галіне выяўленчага мастацтва сьведчыць апошняя работа мастака-гравера Е. С. Мініна, выстаўленая ім на 5-й усебеларускай мастацкай выстаўцы.

Гэта гравюра на дрэве зроблена па заказу віцебскага дзяржаўнага музэю. На гравюры, якая зьяўляецца экс-лібрысам для бібліятэкі азначанага музэю, мы бачым звычайныя атрыбуты нацдэмаўскай сымболікі. На першым пляне зьмешчана фігура сярэдня-вечнага рыцара ў вайсковым убраньні, які сядзіць у задумлівай позе, схіліўшы галаву, каля аднэй з калюмнаў нейкага парталу. Перад рыцарам скрутак паперы з малюнкам нейкага замку, царкоўная вежа, старадаўная ваза ды інш. На заднім пляне, на версе, па кутках—па абодвы баокі парталу зьмешчаны маленькія ледзь прыкметныя, схематычна накіданыя партраты Пушкіна, Леніна і Маркса.

Усе яны трапілі на гравюру ў парадку мастацкага выкананьня пэўнай ідэалёгічна пасьлядоўнай праграмы. Невыпадкова апынуўся на пярэднім пляне і сярэднявечны рыцар, постаць якога нам, дарэчы, добра знаёма.

Гэты рыцар зьяўляецца сымбалем і эмблемай ідэй беларускай буржуазнай дзяржаўнасьці. Вобраз яго быў запазычаны нацдэмамі з сярэдня-вечнага дзяржаўнага гэрбу, вялікага княства Літоўскага, з так званага гэрбу «Пагоні» і адноўлены імі пасьля рэвалюцыі на дзяржаўным сьцягу і гэрбе буржуазнай Беларускай Народнай Рэспублікі.

Пра значэньне, якое надаецца ў рабоце Мініна гэтым элемэнтам, сьведчаць яскрава і прапорцыі гравюры. Рыцар—увасабленьне часоў фэадалізму, гэтага—паводле гістарычных канцэпцый нацдэмаў «Залатога веку» беларускага культурнага адраджэньня і дзяржаўнай магутнасьці, зьмешчаны на пярэднім пляне малюнка, і займае разам з іншымі атрыбутамі сярэднявечча, больш як $^{3}/_{4}$ плошчы усяе гравюры. Гэтыя атрыбуты палкам затулюць партраты Маркса і Леніна. Апошнія зроблены ледзь прыкметнымі штрыхамі ў выглядзе цьмяных напоўсьлупэтаў побач з адпаўкавым на пакерах і па выкананьню партратам Пушкіна, і зьмешчаны мастаком у цёмных куткох гравюры.

Як прапорцыя, так і характар размяшчэньня кампазыцый даннага экс-лібрысу таксама зусім невыпадковы. Яны цалкам адпавядаюць ідэалёгічным установам нацдэмаў ня толькі ў галіне работы над экс-лібрысам, але і ў галіне музэйнай справы. У пытаньнях музэйнага будаўніцтва нацдэмы заўсёды рабілі націск на адлюстраваньне ў музэйнай экспазыцыі і на вывучэньне ў музэйных сховах момантаў фэадальнага мінулага пры абсоўваньні ў бок усяго, што зьвязана з сучаснасьцю, з сацыялістычным будаўніцтвам. Гэтыя установы нацдэмаў і знайшлі яскравае сваё адлюстраваньне ў даным экс лібрысе, які зроблены Мініным для бібліятэкі Віцебскага дзяржаўнага музэю. «Экс-лібрыс—сымбаль, экс лібрыс павінен адбіваць дух бібліятэкі, яе характар, уласьціваськь»,—пісаў калісьці Касьпяровіч, дадаючы, між іншым, што «беларускім экс-лібрысам лічыцца той, які зроблен для беларуса, незалежна ад таго, мастаком якой нацыянальнасьці ён зроблены».

Мы бачым, што ў даннай рабоце мастак Мінін выканаў дырэктыву нацдэмаўскіх тэарэтыкаў, імкнучыся ў сваім экс-лібрысу адлюстраваць у пэўных сымбалях зьмест і напрамак нацдэмаўскіх поглядаў на культурнае будаўніцтва і, у прыватнасьці, на музэйную справу.

Між тым, якраз ад мастака Мініна грамадзкасьць павінна была чакаць канкрэтных узораў ідэёва-творчай перабудовы. З самага пачатку сваёй творчай дзейнасьці ў галіне кніжнага графіі (1925—26 г.г.), у якой ён праявіў сабе выдатным майстрам, мастак Мінін знаходзіўся пад моцнымі ўплывамі нацыянал-дэмакратызму. Сваю значную тэхнічную ўдасканаленасьць у гравюры на дрэве, свой тонкі мастацкі густ Мінін адразу, з першых дзён сваёй творчасьці падпарадкаваў выкананьню ідэалёгічных запатрабаваньняў нацдэмаў, у мастацтве і мастацтвазнаўстве, ён прысьвяціў значную большасьць сваіх твораў выяўленьню старажытнай царкоўнай архітэктуры, шукаючы ў абрысах і контурах сярэднявечных будынках, у царкоўнай арнамэнтыцы свасадменныя і свасасаблівыя адзнакі беларускага «самабытнага» стылю.

У сваіх выдатных па мастацкай тэхніцы гравюрах Мініх адлюстраваў, галоўным чынам, вобразы старога Віцебску—касьцёл сьв. Антона, выконваючы гэтым загады сваіх ідэёвых натхняцеляў—нацдэмаўскіх «тэарэтыкаў» мастацтва Шчакаціхіна, Касьпяровіча ды інш. Недарма нацыянал-дэмакраты заўсёды з захапленьнем адгукаліся аб працах Мініна, рэкламуючы яго ў якасьці выдатнага беларускага нацыянальнага графіка і ўхваляючы форму, зьмест і тэматыку яго твораў.

Гравюра, выстаўленая Мініным на V Усебеларускай выстаўцы, не зьяўляецца першай спробай мастака ў галіне кніжнага знаку (экс-лібрысу). Асаблівай заслугай Мініна Фурман лічыць тое, што «Мінін першы врабіў спробу стварыць нацыянальна беларускі экс-лібрыс. Такія яго гравяваныя кніжныя знакі беларускіх культурных дзеячоў: А. Шлюбскага, М. Касьпяровіча і М. Мялешкі».

Гэтыя гравюры, зробленыя Мініным для кніжных знакаў сваіх ідэёвых кіраўнікоў і настаўнікаў, вядомых нацдэмаў Касьпяровіча, Шлюбскага і Мялешкі, прасякнуты таксама звычайнымі матывамі нацдэмаўскай «самабытнасьці».

Прыведзеных прыкладаў даволі, каб убачыць, што ў параўнаньні з мінулым у ідэёвым і тэматычным напрамку творчасьці Мініна нічога не зьмянілася. Апошняя работа Мініна нічым не адрозьніваецца ад мінулых этапаў яго творчага шляху. Яна гаворыць аб адсутнасьці ў творчасьці Мініна ідэалёгічных зрухаў, аб адсутнасьці імкненьня да актыўнай перабудовы, да адмаўленьня ад мінулых памылак. Яна сьведчыць аб тым, што Мінін працягвае карыстацца у сваёй творчасьці нацдэмаўскай рэцэптурай. Сваёй працай Мінін аб'ектыўна ці суб'ектыўна—гата справы ўсё ўрэшце ня мяняе—дапамагае спробам апошніх рэштку разбітых і разгромленых нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў ажывіць пад фальшыва нацыянальным сьцягам сваю антысавецкую работу і шкодніцкую нацыянальна-культурную будаўніцтву.

АД РЭДАКЦЫІ: Перадрукоўваючы скарочаны артыкул тав. Вольскага з газэты «Літаратура і мастацтва», мы лічым, што ён зьяўляецца сыгналам для праверкі становішча ў віцебскім мастацкім тэхнікуме, адным з выкладчыкаў якога зьяўляецца нацдэм Мінін.

БЫЛЫ ДВАРАНІН І ЯГО КУЛАЦКІЯ МАХІНАЦЫІ.

Б. ЗЭЛІКСОН.

I.

Тав. Сталін у сваёй праграмнай прамове на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) в усёй уласьцівай бальшавікам рашучасьцю ўскрыў недахопы нашай работы ў вёсны. Ён казаў: «Справа перш за ўсё ў зьмесьце работы саветаў, справа ў характары работы саветаў, справа ў тым, хто іменна кіруе саветамі — рэвалюцыянэры, ці контррэвалюцыянэры».

Для жывога прыкладу бярэм Сялюцкі сельсавет, на чале якога стаяў апошнія два гады Чавядаеў—сын дваранина, памылкова дапушчаны ў рады партыі.

Мы прывядзем некалькі фактаў, якія настойліва гавораць, як сын былога патомсьцьвеннага дваранина рабіў сваю справу, дапамагаючы кулакам, зрошыся з імі.

На Сялюцкаму сельсавету мы наглядаем грубае скажэньне дырэктыў ураду ў адносіне сямей і гаспадарак чырвонаармейцаў. Чавядаеў, як старшыня сельсавету, даводзіць цьвёрдае заданьне да сямей чырвонаармейцаў, тлумачачы тым, што моў Шпілёў (гарснаб) даў яму на гэта згоду. Калгасьнік калгасу «Зьвязда» Абразэвіч Іван, сын якога знаходзіцца ў Чырвонай арміі, а другі сын дэмабілізаваўся ў гэтым годзе, з якім Чавядаеў на ў добрых адносінах, выключаецца з калгасу і да яго ледзь недаводзіцца цьвёрдае заданьне. Многа, многа такіх прыкладаў, калі без усялякіх падстаў, ня ведаючы нават дасканала моцнасьці гаспадаркі, Чавядаеў даводзіць цьвёрдыя заданьні.

— Раз выключылі з калгасу, значыць трэба даць цьвёрдае заданьне,—разважае Чавядаеў. А праверыць дэталёва, чаму тая ці іншая гаспадарка выключана з калгасу, гэта сельсавет ня лічыў сваёй справай. І зусім зразумела, што ў выніку такой кулацкай палітыкі засталіся ў калгасе сапраўдныя кулакі. Карначоў, які раней займаўся гандлем, эксплёатаваў чужую працу, гэты махравы кулак застаўся ў калгасе „Зьвязда". Таксама ў адносінах Абразэвіча Уладзіміра, які меў батрачку, трымаў кузьню і бакалейную краму. Заможнікі, якія пралезьлі ў калгас, не чапаліся, яны вальготна і супакойна зараз знаходзяцца ў калгасе „Зьвязда" і робяць свае справы.

Вось першая даведка, якая гаворыць, як Чавядаеў, спажаючы дэкрэт ураду, даводзіў цьвёрдае заданьне да сямей чырвонаармейцаў але «ня бачыў» сапраўдных кулацка-заможных гаспадарак.

II.

6-га студзеня быў праведзены агульны сход калгасьнікаў у калгасе імя Карла Маркса. Гэты сход праводзіў Чавядаеў сумесна з упаўнаважаным гаркомам КП(б)Б та в Калесьнікавым. Там, на гэтым сходзе зрабілі сьпісак у колькасьці 14-ці гаспадарак і выключылі іх з калгасу. Чавядаеў на сходзе гаварыў: „Хто будзе выказвацца супроць гэтага сьпісу, таго пасьцігне той жа лёс".

І калгасьнікі маўчалі. Без галасаваньня, пасьля суровага „усе згодны", былі выключаны 14 гаспадарак, у гэтым ліку 8 бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак.

Прышлося партячэйцы выправіць дапушчаную грубую палітычную памылку, якая грае на руку кулаку. 11-га студзеня быў скліканы другі сход, на якім бядняцка-сярэдняцкія гаспадаркі былі аднаўлёны ў калгас. Чавядаеў атрымаў за гэта ад ячэйкі мяккае „НА ВІД".

Але мы разам з гэтым павінны бясспрэчна запытаць: дзе-ж былі вочы упаўнаважанага гаркому партыі тав. Калесьнікава?

Камуніст Калесьнікаў аказаўся проста шляпай, які, будучы на сходзе, ня змог аддаць сябе справаздачу аб тым, што робіць на сходзе Чавядаеў, што ён штампуе.

Вось гэта—другая даведка, якая характарызуе Чавядаева, сына дваранина, як кулацкага агэнта з партбілетам у кішэні, які праводзіць кулацкую лінію.

III.

Буйныя гандляры з вёскі Жукава—Магарыл Абрам Мэеравіч, Магарыл Абрам Яўсеевіч усе свае гады займаліся гандлем. У 1929 годзе яны індывідуальна абкладзены падаткам У кастрычніку-лістападзе 1932 году іх арыштавалі за спэкуляцыю хлебам і жывёлай. Быў зроблены паказальны працэс у сельсавеце. Але тут на працэсе выступаюць у якасьці сьведак камуністы Чавядаеў і Новікаў, гаворачы, што Магарылы ніколі не займаліся спэкуляцыяй. Ясна, раз выступае сам старшыня сельсавету і загадчык школы ў абарону, спэкулянты былі апраўданы.

І недарма Магарыл з дапамогі настаўніка Буглова устройвае ў мікрапольскай школе для Чавядаева выпіўку. Яны «ацэнцілі» рахунак старшыні за настойлівую абарону. Парт'ячэйка на гэта не рэагавала своечасова, чым праявіла лібэралізм і мягкацеласьць да тых камуністаў, якія з партбілетам у кішэні абаранялі клясавага ворага.

Вось трэцьцяя даведка, якая паказвае твар Чавядаева, выступаючага на абарону кулакоў.

IV.

Ці ведае гарсавет твар старшыні Сялюцкага сельсавету Чавядаева, які па сутнасьці вёў і вядзе кулацкую лінію ў сваёй рабоце, як сын былога дваранина?

Не, ня ведае, бо на апошнім пасяджаньні прэзыдыумам гарсавету была вывешана пастанова: „Раіць пленуму Старасельскага сельсавету абраць старшыней тав. Чавядаева". Гэта здарылася таму, што гарсавет здаваны ад сельсаветаў, ня ведае сельсаветы, і ўрэшце, ня ведае твару старшынь сельсавету.

* * *

«... Вышыбленымі з калеі апошнія рэшткі ўміраючых клясаў: прамыслоўцы і іх чэлядзь, гандляры і іх прысьпешнікі, былыя дваране і папы, кулакі і падкулачнікі, былыя белыя афіцэры і ўраднікі, былыя паліцэйскія і жандары, усялякага роду буржуазныя інтэлігенты шавіністычнага толку і ўсе іншыя антысавецкія элемэнты» (Сталін) распаўзьліся па ўсяму нашаму неаб'ятаму Саюзу, пралезьлі на фабрыкі і заводы, у калгасы, і савгасы, некаторыя з іх нават занялі адказныя работы, пралезьлі ў партыю.

Дваранін Чавядаеў, вышыблены гісторыяй, страціўшы свой тытул, страціўшы сваё добрае жыцьцё, якое будавалася на жорсткай эксплёатацыі, у гэтым дваранінне жыве варожасьць, нянавісьць да савецкай улады. І яго сын, прышоўшы ў сельсавет, заняўшы камандныя высыні, з «спачуцьцём нянавісьці савецкай улады, спачуцьцём лютай варожасьці, да новых форм гаспадаркі, быту і культуры»—рабіў сваю кулацкую справу.

Аб фамілі дваранскай Чавядаевых шмат чаго дадаткова можа сказаць сялюцкая бывпістка Паўлава, зараз працуючая ў сельСТ, з 16 ці гадовага ўзросту батрачыўшая ў паноў, сын якіх зараз папаў на пост старшыні сельсавету.

В. Сялюты.
21—22 студзеня 1933 г.

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

„Барацьба за ахову грамадзкай уласнасьці, барацьба ўсімі мерамі і ўсімі сродкамі, прадастаўляемымі ў наша распарадженьне законамі савецкай улады—зьяўляецца аднэй з асноўных задач партыі".

(Сталін)

Узьняць клясавую пільнасьць.

Пастанова ЦВК і СНК СССР ад 7 жніўня 1932 г. аб ахове сацыялістычнай маёмасьці зьяўляецца гістарычным дакрэтам, які адлюстроўвае нашы вялікія поспехі і мабілізуе масы на далейшую наўхільную барацьбу за умацаваньне асновы савецкага ладу—сацыялістычнай уласнасьці, на далейшую барацьбу за канчатковую перамогу сацыялізму.

Гаворачы аб выніках пяцігодкі за чатыры гады ў галіне барацьбы з рэштамі варожых клясаў, тав. Сталін на Аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК гаварыў:

«Найсьці ў прамую атаку супроць савецкай улады гэтыя пены ўжо не ў стане... Таму дзінае, што застаецца ім рабіць,—гата пакасьціць і шкодзіць рабочым, калгасьнікам, савецкай уладзе, партыі..

Але галоўнае ня ў гэтым. Галоўнае ў «дзейнасьці» гэтых былых людзей сантэль ў тым, што яны арганізуюць масавы крадзёж і хішчэньне дзяржаўнай маёмасьці, кааперацыйнай маёмасьці, калгаснай маёмасьці... Яны чуюць, якбы клясавым інстынктам, што асновай савецкай гаспадаркі зьяўляецца грамадзкая ўласнасьць...»

Рад спраў, якія прайшлі праз савецкі суд, зьяўляюцца жывой адлюстрацыяй гэтых слоў тав. Сталіна.

За апошні час маюць месца шматлікія пакражы сацыялістычнай маёмасьці з прадпрыемстваў, савгасаў і калгасаў Віцебскага раёну. Найбольш характэрнымі з іх зьяўляюцца: пакража 76 пар шоўкавых панчох антыграмадзкім элемэнтам, шофэрам фабрыкі імя КІМ Пятровым; пакража 28 пар панчох прыбіральшчыцай фабрыкі імя Клары Цэткін Карнілавай; пакража гэтр, панчох, рэйтуз, шапачак і інш. работнікай Гурыцкай з фабрыкі імя Клары Цэткін; пакража футры і махоркі на махорачнай фабрыцы; пакражы дзесяткамі пар падошв і заготовак з фабрыкі імя Лекерта; пакража гарнітураў і пальто з фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» і рад буйных пакраж са складаў ЦРК, розных ЗРК, савгасаў і калгасаў.

Гэтыя факты сыгналізуюць аб вялікай засьмечанасьці прадпрыемстваў, савгасаў, калгасаў і кааперацыйных установаў клясава варожым антыграмадзкім і хуліганствуючым элемэнтам.

Перад усёй партыйнай арганізацыяй Віцебску ў першую чаргу, перад усімі рабочымі, ІТР, калгасьнікамі і служачымі, адданымі партыі і савецкай уладзе, стаіць зараз, як ніколі, задача ўзьмацніць клясавую пільнасьць, задача значэньня больш, і значна больш, узмацніць ахову сацыялістычнай маёмасьці.

Перадавыя рабочыя і калгасьнікі Віцебшчыны зусім справядліва ацэньваюць сучасную абстаноўку клясавай барацьбы і патрабуюць ад вораганў пракуратуры і суда самага жорсткага пакараньня ворагаў народу—раскрадальнікаў сацыялістычнай маёмасьці, падрываючых асновы савецкага ладу—сацыялістычную ўласнасьць.

Ніякага лібэралізічаньня з клясавым ворагам, з ворагам народу, з варом і расхіцілелам!

Жорстка і непахільна ажыцьцяўляць дэкрэт ураду ад 7 жніўня 1932 году.

Трэба памятаць словы тав. Сталіна на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК аб тым, што:

«Сільная і магутная дыктатура пралетарыяту,—вось, што нам патрэбна цяпер для таго, каб разьвеяць у прах апошнія рэшткі паміраючых клясаў і разьбіць іх вараўскія махінацыі». (Сталін).

Пам. гарпракурора Абелеў.

Патрабуюць вышэйшай меры сацыяльнай абароны.

Фабрыка „Сьцяг індустрыялізацыі" (па тэлефону, 23 студзеня)

Заслухаўшы інфармацыю старшыні фабкому фабрыкі імя КІМ аб пакражы 76 пар шоўкавых панчох антыграмадзкім элементам шофэрам Пятровым, над якім павісеў абвіцца ў бліжэйшыя дні, у паказальным працэсе, суд, делегаты рабочай канфэрэнцыі фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» кляймяць ганьбой здраднікам рабочае клясы антыграмадзкага клясава-варожага элементу Пятрова і патрабуюць ад пралетарскага суду прымяненьня да яго вышэйшай меры сацыяльнай абароны — расстрэлу.

Здраднікаў і ворагаў народу да расстрэлу.

Агульны сход рабочых фабрыкі імя Лекерта заслухаў інфармацыю аб пакражы шофэрам фабрыкі імя КІМ Пятровым 70 пар панчох з гэтай фабрыкі і інфармацыю аб пакражах з фабрыкі імя Лекерта, утвараемых групай варо́ў на чале з былым рабочым фабрыкі Рудніцкім М.

Сход лічыць гэтых людзей ворагамі народу, якія пакражамі імкнуліся разбурыць сацыялістычнае прадпрыемства і падарваць моц савецкай улады.

Сход патрабаваў ад сэсіі Вярхоўнага суду БССР прымяненьня да здраднікаў рабочае клясы ворагаў народу—Пятрова і Рудніцкага вышэйшай меры сацыяльнай абароны — расстрэлу.

Заўтра, 26 студзеня, а 7 гадз. увечары, у вялікай залі гаркому партыі скліканца інструкцыйная нарада па пытаньні аб выдачы наборных дакумантаў на люты 1933 год.

На нараду ў абавязковым парадку павінны зьявіцца: дырэктары прадпрыемстваў, навучальных і інш. установаў, сакратары парткалектываў і ячэек, старшыні ФЗМК, старшыні праўленьняў жакт'аў і начальнікі аддзяленьняў міліцыі.

Гарком КП(б)Б.

ПАСТАНОВА

Віцебскай гарадзкой інспэкцыі снабжэньня ад 24 студзеня 1933 года.

Абавязаць усе прадпрыемствы і ўстановы гор. Віцебску прадставіць у гар. інспэкцыю снабжэньня (гарсавет пакой № 33) заяўкі аб фактычнай наяўнасьці рабочых і іх утрыманцаў на дзень дачы заявак.

Заяўкі прадставіць не пазьней 27 студзеня па наступнай форме:

КАТЭГОРЫЯ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ.	КОЛЬКАСЬЦЬ ЛЮДЗЕЙ.	
	Рабочых.	Утрыманцаў.
1) Асноўных рабочых цэхаў		
2) Работнікі ІТР . . .		
3) Практыкантаў . .		
4) Прыбіральшчыцы цэхаў		
5) МАП (вартаўнікі, прыбіральшчыцы, ня цэхаў і г. д.)		
6) Работнікі транспарту прадпрыемства . .		
7) Ст. бухгальт. і бухгальт		
8) Дахтароў мэдпункт.		
9) Вылуч. унутры ф-кі		
10) Вылуч. паза ф-кі		
11) Іншыя служачыя .		
12 Прымацаваных настаўнікаў указаць школы		
13) Павары і работнікі прылаўку		

Заяўкі падпісваюцца дырэктарам прадпрыемства і яго намесьнікам па рабочаму снабжэньню.

Непрадстаўленьнем заявак да 28 студзеня 1933 г. будзеце лішаны сн бжэньнем прадуктамі і за зрыў рабочага снабжэньня нясе поўную адказнасьць дырэктар прадпрыемства і загадчык установы.

Віцгарсанаб Шпілеў.

У сувязі З ЛІКВІДАЦЫЯЙ 22-га БУДВУЧАСТКУ 1-га Савгасбудтрэсту з 15 студзеня ЛІКВІДКОМ ПАВЕДАМЛЯЕ ЎСІХ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ, якія працавалі ў гэтым вучастку і якія не атрымалі аблігацыі пазыкі «3-ці, рашаючы» і «4-ты, завяршальны год пяцігодкі», што яны павінны іх атрымаць да 1 лютага 1933 г., пасьля якога тэрміну апошнія будуць зданы ў ашчадкасу ў абязьлічаным відзе.
70—3—1 ЛІКВІДКОМ.

Сёньня, у больніцы імя Калініна, а 8½ гадз, увечары,

СХОД НАВУКОВАЙ АСАЦЫЯЦЫІ ЎРАЧЭЙ.

1) Доктар ВАЛЬШОНАК; вынікі савецка-германскага мэдыцынскага тыдню.
2) Доктар ФРЫДМАН аб навуковай камандыроўцы. 84—1—1

ВІЦЕБСКІ ДЗЕНЬ.

* ДАДАТКОВАЯ ПАДПІСКА НА ПАЗЫКУ «4-ы, завяршальны» па фабрыцы «Дзьвіна» складае 12000 рублёў.

* НА ФАБРЫЦЫ „ДЗЬВІНА", замацаваліся да канца другой пяцігодкі 1000 рабочых.

* НА ФАБРЫЦЫ „ДЗЬВІНА" дзякуючы добра разгорнутай масавай рабоце па распаўсюджваньню 7-й лётарэі Асоавіяхэму, білетаў рэалізавана замест 1800—1945 рублёў.

* САЮЗ МЭДСАНПРАЦЫ заключыў з рэдгазэтай з магілёўскім і гомельскім саюзам мэдсанпрацы на лепшае правядзеньне справаздачы на перавыборчай кампаніі ФЗМК.

* З 15-га СТУДЗЕНЯ пачала працаваць пры гарсавеце фізкультуры сэкцыя бокса (у клюбе імя Клары Цэткін).

* 12-га СТУДЗЕНЯ адбыўся хакейны матч паміж першай і другой зборнымі камандамі гораду, 5 і 4 у карысьць першай каманды.

* У КЛЮБЕ „ПРАФІНТЭРН" з 15-га студзеня адчынена гарадзкая шахматна-шашачная база. Перны сэанс адбыўся ў дзень адкрыцьця. Па шахматам сэансаваў Сілін, па шашкам Берлінкоў.

* ЗА ПРЯЖКУ І ЗВЫЎ ЗАРАТОВАК па Мікалабўскім сельсавеце выключаны з радоў партыі КРАСІКАЎ. Партызанская камісія пастанавіла лічыць немагчымым далейшае прабываньне Красікава ў радах чырвонаармейцаў.

* ЗА ДАЧУ ПРЫМУСОВАГА АСАРТЫМЭНТУ бюро скарагаў гарКК—РСІ пастановіла загадчыку магазину ЗРК № 1 скурпікаў тав. ГЕЛІНУ абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем і занясеньнем у працоўны сьпіс.

26-га студзеня, а 10 гадз. раніцы, у гарсавеце (пакой № 29)

склікаецца нарада ўсіх дырэктароў прадпрыемстваў, фабрык і заводаў,

старшынь кааперацыйных установаў, ЗРК, Белсанпляц, начальнікаў пажарных команд усіх раёнаў гораду, начальнікаў добраахвотных пажарных камандпрадпрыемстваў і установаў. Запрашаюцца асабіста тт. Клейнберг, Юдзінкін (АДПУ) і Эльксна (міліцыя).
83—1—1 ГАРСАВЕТ.

ТОРГСІН

адчыніў па Вагзальнай вул. № 43 аддзяленьне ЎНІВЭРМАГУ.

Акрамя ўсіх тавараў, якія знаходзяцца ва ўнівэрмазе, аддзяленьне будзе прадаваць мяса, рыбу, пячоны хлеб лепшай якасьці.

Пры аддзяленьні знаходзіцца прыёмачны пункт „Масторгу" для прыёму ад насельніцтва бытавога золата.
79—4—1 „ТОРГСІН".

Кіраўніцтва трамваю і аўтабусаў абвяшчае, што з 26-га студзеня АНУЛЮЮЦЦА ўсе бясплатныя трамвайныя карткі, выданыя ў 1932 г.
Кіраўніцтва ТРАМВАЮ.
82—3—1

ВІЦЕБСКІ КАМБІНАТ САЮЗМЯСА

прапануе ўсім зацікаўленым арганізацыям, выдаючым забой уласнай жывёлы, выслаць на камбінат свайго прадстаўніка, для заключэньня ўмовы за забой жывёлы. Арганізацыі, не заключыўшыя гэтых умоў, будуць пазбаўлены магчымасьці выдаваць забой жывёлы на разьбіванку.
ДЫРЭКЦЫЯ.
78—3—1

26-га студзеня ў клюбе пачэсьнікаў у паказальным пасяджэньні ваеннай сэкціі Верхсуда БССР будзе слухацца справа шофэра фабрыкі імя КІМ Пятрова паводле пастановы ЦВК і СНК СССР ад 7 жніўня 1932 г. аб ахове грамадзкай (сацыялістычнай) уласнасьці.

Старшынствуе — член Верхсуда БССР т. Шубік.

Дзяржаўнае абвінавачваньне падтрымлівае памоцнік гарпракурора т. Абелеў.

Абарону падтрымлівае член калегіі абаронцаў Хазанаў.

ЗГУБЛЕНА пасьведчаньне асабовасьці, выд. адмаддзелам на імя Калачовай Ганны Мікалаёўны. 71—1—1.

ЗГУБЛЕНЫ наступныя дакументы на імя Сарданоўскага: 1) пасьведчаньне асабовасьці, выд. Каломенскай гарміліцыяй, 2) членскі квіток саюзу сувязі, выд. Каломенскай канторай і 3) пасьведчаньне аб скончаньні школы семігодкі. 72—1—1.

Віцгарліт № 12. Друкарня «Камінтэрн», Бальшавіцкая, 10. Тыраж 8.500 экз.